ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух“)
На 1 мес. . . — 80 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Зьвыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. задатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

Пралетары усіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная контора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

СЕРАДА, 5 лютага 1930 г.
№ 30 (3538)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ і ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

АБАГУЛЕНЬНЕ НАСЕНЬНЯ І ЖЫВЕЛЫ ЗЛАЧЫННА ЗАЦЯГВАЕЦЦА

Слабы тэмп засыпкі насенных фондаў на руку клясаваму ворагу

КЛІМАЎШЧЫНА АБАГУЛІЛА 80% НАСЕНЬНЯ. АКРУГІ І РАЁНЫ БССР, РАЎНЯЮЦЦЯ ПА КЛІМАЎШЧЫНЕ!

Земорганы,—ня трацячы ні гадзіны, перабудавацца на бальшавіцкі лад, стаць сапраўднымі апэрацыйнымі штабамі па кіраўніцтве пасеўнымі баямі!

Апэрацыйная зводка з пасеўнага фронту

СЕРАДА, 5-га лютага

Атрыманыя афіцыйныя весткі з раёнаў БССР сьведчаць аб тым, што становішча з абагуленьнем насенных фондаў у калгасах на 1-га лютага **мала чым палепшылася за апошнія 10 дзён.**

Калі прыняць пад увагу, што абагуленьне насенных фондаў павінна быць скончана ў БССР не пазьней 10-га лютага, дык поўнае ажыцьцяўленьне гэтага важнейшага мерапрыемства **ў тэрмін ня будзе выканана,** калі ня будуць ужыты тэрміновыя і рашучыя меры.

Паводле даных 71 раёну з 101, якія існуюць у БССР, па 1-га лютага заданьне аб стварэньні абагуленых насенных фондаў **выканана на 29,4 проц. Усяго абагулена 42.013,3 тон насеньня.**

Зусім пагражаючае становішча **наглядаецца па Менскай акрузе,** якая выканала заданьне **ўсяго на 14,2 проц.** За ёю ідзе **Полацкая акруга — 17,3 проц.** заданьня, **Віцебская—25,3 проц., Мазырская—25,5, Аршанская —31,4 проц., Магілёўская—32 проц., Гомельская—35,6 проц., Бабруйская —53,2 проц.** заданьня.

Паколькі **Магілёўская акруга** зьяўляецца акругай **суцэльнае калектывізацыі** процант абагуленьня насеньня ў яе калгасах ня можа быць **прызнаны здавальняючым,** нават у параўнаньні з іншымі акругамі, якія не зьяўляюцца акругамі суцэльнае калектывізацыі.

На апошнім месцы па выкананьні заданьня абагуленьня насеньня стаяць наступныя раёны: **Сьмілавіцкі, Пухавіцкі, Чэрвеньскі, Барысаўскі, Грэскі (Менскае акругі).**

Старобінскі, Любаньскі, Глускі (Бабруйская акругі).

Высачанскі, Гарадонскі (Віцебскае акругі).

Буда-Кашалёўскі (Гомельскае акругі).

Бялыніцкі, Чаўскі, Чэчэвіцкі, Прапойскі, Краснапольскі (Магілёўскае акругі).

Петрыкаўскі (Мазырскае акругі).

Круглянскі (Аршанскае акругі).

Дрысенскі, Расонскі, Ветрынскі (Полацкае акругі).

На гэтых раёнах насеньне абагулена ад 3-х да 15 проц. заданьня.

Гэткае-ж прыблізна становішча па няпоўных даных—і ў тых 30-ці раёнах, якія вестак не прыслалі.

Лепш усяго стаіць справа ў Клімавіцкім раёне, які выканаў 80 проц. заданьня.

Увогуле адзначаныя 71 раён БССР павінны абагуліць каля 142.695 тон насеньня, абагулена-ж усяго каля 42.000 тон.

Павольнае выкананьне дырэктыў абагуленьня насеньня ў калгасах, якое наглядаецца ў большасьці акруг, сьведчыць аб невыстарчальнасьці і нерашучасьці мер, **якія прыняты НКЗ БССР.** Паданыя лічбы аб выкананьні заданьня абагуленьня насеньня гавораць, што на парадак дня трэба паставіць пытаньне аб зьняцьці з пасад некаторых загадчыкаў акрэа і райза, якія паказалі сваю няздольнасьць у выкананьні важнейшай дырэктывы партыі.

Таксама слаба пасунулася наперад і абагуленьне жывёлы (цягавай і прадукцыйнай) у калгасах. Усяго па БССР на 1-га лютага на 71 раёне заданьне па абагуленьні жывёлы выканана на 24,2 проц. Абагулена 127.691 коняй і рагатай жывёлы. На апошнім месцы—Аршанская акруга—выканала 11,8 проц. зданьня. **Як ні дзіўна, але ў хвасьце і Магілёўская акруга суцэльнае калектывізацыі,** якая выканала заданьне ўсяго на 16,4 проц. **За ёю Менская акруга—17,6 проц., Бабруйская акруга—18,7 проц., Полацкая—23,9 проц., Віцебская акруга —37,9 Мазырская акруга— 38 проц., Гомельская акруга—39,8 проц.**

Зусім адстаюць у галіне абагуленьня жывёлы: Барысаўскі, Чэрвеньскі, Копыскі, Пухавіцкі, Самахвалавіцкі, Любаньскі, Парыцкі, Жлобінскі, Высачанскі Глускі, Чашніцкі, Сененскі, Шклоўскі, Магілёўскі, Чаўскі, Чэрыкаўскі, Чычэвіцкі, Журавіцкі, Прапойскі, Краснапольскі, Лельчыцкі, Коханаўскі, Дубровенскі, Круглянскі, Горацкі, Мсьціслаўскі і Дрысенскі раёны, якія выканалі ад 2-х да 12 проц. заданьня.

На 1-га лютага па 71 раёне БССР калектывізавана 2.363.616 гэкт., або 38,1 плошчы рэспублікі. Пасьпяховей усяго ідзе калектывізацыя Магілёўскае акругі—62 проц. тэрыторыі.

За ёю ідуць: Віцебская і Аршанская акругі—37,8 проц., Мазырская акруга —35,8 проц., Віцебская—35 проц., Менская—28,4 проц., Бабруйская—26,5 проц., Полацкая—25,3 проц.

Усё яшчэ адстаюць Лагойскі, Смалявіцкі, Бярэзінскі, Асіпавіцкі, Бабруйскі, Цэрахаўскі, Расонскі, Ушацкі раёны, якія калектывізаваны ўсяго на 5—12 проц.

Больш выразнасьці і адказнасьці

Чэрыкаўскі раён стаіць пасьля Клімаўшчыны на другім месцы па суцэльнай калектывізацыі. Раён калектывізаваны на ўсе 100 проц. Ён разьбіваецца на 5 буйных калгасаў. Самы вялікі, «Чырвоны Пуцілавец», налічвае 60.000 гэкт. зямельнае плошчы.

За агульнай сумяціцай у раённых установах ня відаць баявога тэмпу, парадку, які павінен быць у Чэрыкаўшчыне, як раёне суцэльнае калектывізацыі, у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

Выразнасьць, плянавасьць і прадуманасьць у рабоце адсутнічае.

План веснавое сяўбы зацьверджаны райвыканкомам толькі сёньня, а калі ён дойдзе да калгасу — **невядома.** Надзвычайны ўпаўнаважаны па пасеўнай кампаніі таксама вылучаны толькі сёньня.

Ня гледзячы на 100 проц. калектывізацыю раёну, **рад арганізаваных калгасаў яшчэ не афармлены.** Брыгады складзеныя з мясцовага актыву і магілёўскіх рабочых працуюць бессыстэмна.

Арганізатарскіх сіл у калгасах не хапае, а работы пагорла. Усе пытаюцца: «калі прыедуць рабочыя, мабілізаваныя на сталую работу ў калгасах». З нецярплівасьцю чакаюць іх калгасьнікі. У асобе сормаўскіх, віцебскіх і менскіх рабочых калгасьнікі Чэрыкаўшчыны жадаюць убачыць тых арганізатараў, якія зараз патрэбны ў калгасах.

Батрацтва і беднота, а за імі і сераднякі, патрабуюць **больш рашуча, бяз усякай папяровай валакіты, арганізавана прыступіць да раскулачваньня,** а контрэвалюцыянэраў, якія выступаюць актыўна, тут-жа прыцягваць да судовай адказнасьці.

Між тым раённае кіраўніцтва чамусьці марудзіць з гэтай важнейшай палітычнай задачай у раёне суцэльнай калектывізацыі, **дзе ліквідацыя кулацкіх гаспадарак не павінна зацягвацца на доўгі тэрмін.**

Кулацтва ў раёне апошнімі тыднямі праяўляе надзвычайную актыўнасьць у барацьбе з калгасамі. У радзе месц кулакі падпалілі калгасныя сьвірны, запалохваюць калгасьнікаў, пагражаюць расправай.

Усякая маруднасьць у раскулачваньні толькі на руку кулаку. У інтарэсах узмацненьня калгасаў і пасьпяховае падрыхтоўкі да веснавое сяўбы, раскулачваньне ў раёне суцэльнае калектывізацыі павінна быць праведзена максымальна арганізавана і хутка.

Практычная падрыхтоўка да сяўбы ў раёне таксама праводзіцца вельмі слаба. На сёньнішні дзень сабрана ў абагуленыя сьвірны **толькі 22 проц. патрэбнага насеньня. Ачышчана толькі 28 проц. насеньня.**

У райкоме партыі гаворыць, што не хапае машын, агрономы-ж заяўляюць, што пры ўмелым выкарыстоўваньні машын, апошнімі можна ачысьціць усё насеньне. Зараз усе машыны працуюць у адну зьмену. Праўленьні калгасаў яшчэ не дадумаліся да таго, **каб перавесьці іх на трохзьменную работу,** каб правільна разьмеркаваць іх працу паміж калгасьнікамі.

Вапнавы млын, які знаходзіцца ў Раўчыцкім сельсавеце, не працуе. Аб ім нават і забылі. А, між іншым, ён навіпен паводле пляну выпрацаваць **2.400 тон вапны,** прызначанай для вапнаваньня глебы ня толькі Чэрыкаўшчыны, але і суседніх раёнаў. Попел у раёне ня зьбіраецца. Дагэтуль не сабрана ні адной тоны, па пляну-ж павінна быць сабрана 235 тон.

Майстэрні па рамонце с.-г. машын не працуюць, іх па пляну павінна быць 4, па сёньнішні дзень ёсьць толькі адна цэнтральная майстэрня ў Чэрыкаве. Да абсталяваньня падраённых майстэрань-кузьняў яшчэ не прыступалі.

Асабліва востра ў раёне стаіць пытаньне з арганамічнымі кадрамі. На сёньнішні дзень у раёне знаходзяцца жывёлавод, паляводы і старшы аграном—Чарноў. Ён—былы арганамічны старэста, адукаваны агранамічнай адукацыі ня мае і зусім не падыходзіць да пасады райагранома. Чарноў сядзеў на працягу 2-х месяцаў над складаньнем пляну пасеўнай кампаніі і, урэшце, 23 студзеня прышоў на пасяджэньне райвыканкому і прызнаўся: «плян скласьці не магу».

Больш выразнасьці, плянавасьці і асабліва пэрсанальнай адказнасьці. Вось, чаго не хапае на сёньнішні дзень Чэрыкаўшчыне ў справе баявое падрыхтоўкі да веснавое сяўбы.

БРЫГАДЗІР «ЗЬВЯЗДЫ»
В. ВОІНАЎ.

ЗЬНЯЦЬ ЗА СЛАБОЕ КІРАЎНІЦТВА ПАСЕУКАМПАНІЯЙ!

Загад упоўнаважанага СНК БССР па правядзеньні веснавое сельска-гаспадарчае кампаніі

За недапушчальна слабую работу і кіраўніцтва па стварэньні абагуленых насенных фондаў і жывёлы ў калгасах зьняць з пасады упоўнаважанага па пасеўкампаніі Менскай акругі тав. КАРАНЕЎСКАГА.

Прасіць Менскі акруговы выканаўчы камітэт прызначыць іншую асобу па правядзеньні веснавое пасеўнае кампаніі па Менскай акрузе.

Запрапанаваць акруговым выканаўчым камітэтам за слабую працу па стварэньні насенных фондаў зьняць з работы упоўнаважаных пасеўнай кампаніі наступных раёнаў: па Бабруйскай акрузе — Старобінскага і Глускага раёнаў, па Віцебскай — Высачанскага, па Магілёўскай — Чычэвіцкага, па Мазырскай — Петрыкаўскага, па Аршанскай — Круглянскага, па Полацкай — Ветрынскага, па Менскай — Смалявіцкага і Грэскага.

Упоўнаважаны СНК БССР па пасеўкампаніі РАЧЫЦКІ.

Пад суд за зрыў пасеўкампаніі!

(Ад нашага аршанскага карэспандэнта)

Пляны веснавое сяўбы павінны былі да 25-га студзеня быць даведзены да калгасаў і вёсак. Акруговы плян быў накіраваны ў раёны толькі 11-га студзеня.

За два тыдні можна было шмат зрабіць, каб азнаёміць калгасы і вёскі з іх задачамі да пасеўнае кампаніі. Але зрабілі гэта толькі некаторыя раёны Аршаншчыны. Значная большасьць раёнаў з давядзеньнем пляну да калгасаў і вёскі спазьнілася, а частка адклеслася да гэтага нават злачынна нядбайна.

Аршанскі агранам Быліцкі атрымаў акруговы плян своячасова, **але на працягу двух тыдняў нічога не рабіў.** Толькі 25-га студзеня, над націсканам акруговага ўпаўнаважанага па правядзеньні пасеўнае кампаніі, **Быліцкі паказаў плян старшыні Райвыканкому.**

Круглянскі агранам, атрымаўшы плян веснавое сяўбы, **палажыў яго ў стол і толькі 31-га студзеня ён успамянуў, што неабходна тое-сёе зрабіць, каб і калгасы ведалі аб гэтым пляне.**

Загадчык райземаддзелу Капыльскага райвыканкому Таўкачоў і райагранам Аўхукоў зусім забыліся пра ачыстку насеньня, забыліся, што зараз трэба машыны выкарыстоўваць і нагружаць іх дадакузу.

Калі-ж з акругі запатрабавалі весткі аб збожжаачыстцы, **дык лічбы яны, па прыкладзе старых чыноўнікаў, бралі «са столі».**

У Багушэўскім раёне збожжаачыстка таксама ідзе дрэнна, машыны не выкарыстоўваліся і стаялі доўгі час без усякага руху і ніхто не паклапаціўся, каб пусьціць іх у ход.

У Мсьціслаўскім раёне ня так даўно было зроблена абсьледаваньне падрыхтоўкі да сяўбы. Сяму-таму далі папярэджаньні. Здавалася, што работа разгорнецца, як належыць. І сапраўды, у акругу пачалі паступаць весткі, што ў раёне ўсё ўжо ідзе добра.

Калі-ж гэтымі днямі зноў зрабілі праверку, дык выявілася, што на справе ў раёне ўсё засталося, як і раней. **Загадчык райза і райагранам дасылалі ў акругу хлусьлівыя весткі і ашуквалі акруговыя ўстановы.**

Такім зьявішчам трэба зараз-жа палажыць канец. За нядбайныя адносіны ў падрыхтоўцы да сяўбы, за ўвядзеньне ў эман аб сапраўдным становішчы рэчаў трэба зараз-жа прыцягваць да судовай адказнасьці.

А. М.

РАШУЧЫ ПАВАРОТ ЯШЧЭ НЯ ЗРОБЛЕНЫ

Вялізарныя тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва даўно ўжо патрабуюць перабудовы ўсяе работы партыі, саветаў і прафсаюзаў. Пра гэта гаварылася, паўтаралася і паўтараецца нязьлічоная колькасьць раз. Аднак, да гэтага часу гутарак было значна больш, чым справы. У сапраўднасьці, нават партыйныя арганізацыі (не гаворачы ўжо аб прафсаюзных і савецкіх), як сьлед, ушчыльную тварам да пытаньняў гаспадарчага будаўніцтва не павярнуліся. Праўда, поўныя дасягненьні ў гэтай галіне маюцца. Даволі прыпамянуць кіраўніцтва хлебазагатоўчымі кампаніямі ў мінулым і ў гэтым годзе, правядзеньне пасеўных кампаній, бліскучыя посьпехі на розных вучастках прамысловасьці, разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва і рост ударных брыгад, нарэшце, правядзеньне суцэльнае калектывізацыі ў цэлым радзе раёнаў, акруг, а за апошні час і цэлых абласьцей.

Аднак, трэба канстатаваць, што ўсе гэтыя посьпехі дасягаліся пераважна мэтадамі, так званай, «ударнай» кампанейскай працы, мабілізацыі і г. д. Між тым, сацыялістычнае спаборніцтва ў нас да сучаснага моманту ня стала арганічным, нармальным і штодзённым мэтадам працы, а праводзілася звычайна ва ўдарным, агітацыйным парадку. Такім шляхам дасягаліся відомыя вынікі, але яны ня былі мвыувыгуГЧЧв вытворчага энтузіязму, з прычыны ўзмоцненае агітацыі на тым ці іншым заводзе падымалася, а потым спадала; наступала рэакцыя. Пералом дасягаўся, але забясьпечыць, замацаваць яго мы часта-густа не маглі. І адны—тыя-ж заводы набываўшы на чырвонай дошцы, потым ціхенька, памаленьку, часамі нязрыкметна для саміх сябе, пераандроўвалі на чорную.

Трэба раз назаўсёды ўявіць, што адзінымі кампанейскімі мэтадамі мы выкананьня прамфінпляну, рэалізацыі рэкордных лічбаў гэтага году ў галіне зьніжэньня сабекошту, падняцьця прадукцыйнасьці працы, павышэньня якасьці прадукцыі не атрымаем. **Для гэтага трэба зрабіць рашучы паварот ва ўсёй рэбоце партыйных арганізацый, камітэтаў і ячэек, якога мы да сучаснага моманту яшчэ ня маем.**

Што трэба для сапраўднага павароту нашых арганізацый тварам да вытворчасьці, для сапраўднай перабудовы іх радоў, значыцца, для сапраўднага забясьпячэньня вызначаных намі вялізарных тэмпаў індустрыялізацыі? Трэба, перш за ўсе, каб **кожны партыйны камітэт не выпадкова, урыўкамі, ад правалу да правалу, а ў плянавым, сыстэматычным і штодзённым парадку працаваў над выкананьнем прамфінпляну.** Трэба, каб кожная партыйная ячэйка стала на чале, а не ў хвасьце (як гэта да сучаснага моманту часта бывае) руху рбочых мас за выкананьне прамфінпляну. Трэба стварыць у заводах арганізацыях такую атмасфэру, каб **ні адзін камуністы, які працуе на вытворчасьці, ня мог і падумаць аб тым, каб ня прымаць удзелу ва ўдарнай брыгадзе. Пасьля неабходнай растлумачальнай работы, трэба ў адносінах да такіх «камуністых» устанавіць адносіны, як да дэзэртыраў і шкурнікаў, якім ня месца ў радох партыі.** Трэба каб усе мерапрыемствы гаспадарчых органаў, накіраваныя да падняцьця прадукцыйнасьці працы, зьніжэньня сабекошту і павышэньня якасьці прадукцыі, сустракалі поўнае аднадушнае і згуртаванае падтрыманьне ячэйкі. Трэба як мага цясьней зьвязаць работу па выкананьні прамфінпляну з вярбоўкай, у рады партыі, каб маса бачыла ў аблічы камустых і ўсіх рабочых, якія ўступаюць у партыю, перадавых байцоў за выкананьне прамфінпляну.

Урэшце, яшчэ і яшчэ раз трэба ўмацаваць партыйнае кіраўніцтва і партыйную работу ў цэху. У нас масавая работа за апошнія гады не стаяла на належнай вышыні. Прыняць яе неабходна. Гэта адна з важнейшых умоў выкананьня прамфінпляну. Гэта адна з важнейшых задач парторганаў, зьвязаная з іх рэарганізацыяй.

Рашучы паварот па ўсёй лініі да вытворчасьці, да гаспадаркі яшчэ ня зроблены нашай партыйнай арганізацыяй. Але ён будзе зроблены.

(«ПРАВДА»).

Працэс аўстрыйскай „Ротэ Фанэ“

Поўны правал абвінавачаньня

ВЕНА, 2. Скончыўся працэс па справе рэдактара органу Аўстрыйскай кампартыі «Ротэ Фанэ» Цукэра. Цукэр апраўданы. Прысяжныя адхілілі ўсе 29 пунктаў абвінавачаньня.

На пасяджэньні суду абвінавачаны Цукэр у сваёй прамове падкрэсьліў, што хаймвэр (арганізацыя фашыстых) усё мацней урастае ў дзяржаўны апарат і ў аўстрыйскую армію.

Пасьля шматлікіх суцычак з пракурорам, пасьля шматлікіх заўваг, зробленых абвінавачаньню, старшыня суду аштрафаваў Цукэра на 50 шылінгаў за тое, што ён назваў ягодніка і забойцам рабочых начальніка штабу хаймвэру, прускага маёра Пабста, удзельніка забойства Лібкнэхта і Люксэмбург. Здарыўся інцыдэнт таксама і з прысяжнымі засядацелямі, бо ў часе допыту Цукэра некаторыя прысяжныя дазволілі сабе воклічы і выкрыкі, накіраваныя супроць абвінавачанага з яўнаю мэтаю стварыць сярод прысяжных варожы настрой да абвінавачанага. Абарона патрабавала замены гэтых прысяжных, але суд адхіліў гэтае запатрабаваньне.

У сваёй абвінавальнай прамове пракурор супрацьпастаўляў кампартыі партыю сацыял - дэмакратыўную, паказаўшы, што сацыял - дэмакраты адхіляюць мэтад гвалту ў барацьбе супроць фашызму. Па словах пракурора «палітыка сацыял - дэмакратаў у вышэйшай ступені прасякнута сьвядомасьцю».

Далей пракурор кваліфікаваў як зьяўважаньне службовае асобы характарыстыку Вейта, як «аўстрыйскага Цэрэбэля».

Абаронца ў сваёй прамове канстатаваў, што працэс «Ротэ Фанэ» зьяўляецца на сутнасьці працэсам супроць палітыкі кампартыі. Ня гледзячы на ўсе ўхітрэньні абвінавачаньня, усё-ж быў вынесены апраўдальны прысуд.

«Ротэ Фанэ» піша з гэтае прычыны: «Пастанова прысяжных азначае **ня толькі крах інсэнізаванага супроць кампартыі абвінавачаньня, але і асуджэньне фашызму і сацыял - фашызму прысяжнымі».**

ПАРЫСКАЯ АКРУГОВАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ КПФ

Рабочыя патрабуюць бязьлітаснай барацьбы з апартунізмам

ПАРЫЖ, 3. Адчынілася канфэрэнцыя парыскай акруговай арганізацыі кампартыі Францыі. З 133 дэлегатаў канфэрэнцыі з рашаючым голасам, па долю рабочых ад станка прыходзіцца 92 дэлегаты.

У вельмі ажыўленых спрэчках па дакладзе парыскага камітэту выступілі дзесяткі дэлегатаў. Вялікую ўвагу канфэрэнцыі прыцягнулі пытаньні барацьбы з апартунізмам ва унітарных прафсаюзах. Дэлегаты адзначаюць неабходнасьць бязьлітаснае барацьбы супроць усіх рознавіднасьцяй апартунізму ў радох партыі і камсамолу і да згуртаваньня галоўнага ўдару на правых апартуністых у тэорыі і практыцы, не забываючы пры гэтым і аб барацьбе з рэшткамі ультра-левых парыскай партыйнай арганізацыі.

Рад дэлегатаў канфэрэнцыі, спасылаючыся на прыклад адыходу ад партыі і простага рэнэгацтва камуністых—муніцыпальных саветнікаў, патрабаваў узмацненьня партыйнага кантролю над муніцыпальнай і парляманцкай дзейнасьцю камуністых. Прамоўцы зазначалі, што парляманцкая і муніцыпальная дзейнасьць зьяўляецца спрыяльнаю глебаю для разьвіцьця правых ухілаў; у прыватнасьці адзначалася двусэнсовая пазыцыя адыходзячага ад партыі камуністычнага дэпутата Пікэмаля. Выступіўшы ад імя палітычнае камісіі канфэрэнцыі сакратар Парыскага камітэту Варанья падкрэсьліў, што зараз э выпрацаньнем камуністычнае лініі ў арганізацыі і пасьляховай барацьбой супроць правых апартуністых і ўльтра-левага ўхілу створаны спрыяючыя прадпасылкі для разгортваньня масавае работы і ўзмацненьня вярбоўкі ў партыю.

Вялікую цікавасьць выклікала выступленьне Рожэ, прадстаўніка аднаго з сялянскіх раёнаў Парыскай акругі. Рожэ паказаў на глыбокі аграрны крызіс, які перажывае Францыя. Гэты крызіс вядзе да абяздпеньня шырокіх мас працоўнага сялянства, а таксама да радыкалізацыі сельска-гаспадарчых рабочых. Крызіс прыводзіць да росту беспрацоўя ў сельскай гаспадарцы і да адыходу рабочых з вёскі ў горад. Рожэ падкрэсьліў неабходнасьць для партыі ўзмацніць работу сярод сялян, якія зараз энэргічна «апрацоўваюцца» фашысцкімі элемэнтамі, стараюцца адарваць сялян ад рабочае клясы.

Антысавецкая кампанія працягваецца

Правакацыйныя дзеяньні французкае паліцыі

ПАРЫЖ, 3. Шалёнае цкаваньне поўнамоцнага прадстаўніцтва СССР і наогул усіх савецкіх грамадзян, якое разгарнута ў Парыжы, ня вычэрпваецца паклёпніцкай кампаніяй, белагвардзейскай, паліцэйскай і бульварнай лаянкай. У прэсе за апошнія дні паявіліся наступныя весткі — паліцэйскія агенты затрымлівалі супрацоўнікаў і наведвальнікаў, якія прыходзілі ў поўнамоцнае прадстаўніцтва, правяралі і апытвалі іх аб матыве наведваньня поўнамоцнага прадстаўніцтва. Затрыманы другі сакратар поўнамоцнага прадстаўніцтва тав. Мешчаракаў, сакратар саюзу «Возвращение на родину» савецкі грамадзянін Блоха быў арыштаваны і праз некалькі гадзін у адміністрацыйным парадку высланы з Францыі. У ноч на 3-га лютага перад будынкам поўнамоцнага прадстаўніцтва буяніла банда з крыкамі: «Вярнеце Куцепава», «Далоў саветы» і г. д. Удзельнікі банды былі затрыманы паліцыяй, але потым усе былі вызвалены. (ТАСС).

Сац.-фашыстыя патрабуюць павялічэньня ўзбраеньняў

ПРАГА, 29. У парламанце скончылася абгаварэньне бюджэту вайсковага міністэрства.

Выступаўшыя ў спрэчках прадстаўнікі сацыял-фашысцкіх партый—сацыял-дэмакраты і нацыянал - сацыялісты выкрылі сябе, як адкрытых прыхільнікаў імпэрыялістычнага мілітарызму.

„РАСПРОДАЖ“ ПОЛЬШЧЫ

Прасяканьне замежнага капіталу ў Польшчу ўсё ўзмацняецца. Характэрна пры гэтым, што замежны капітал ня будзе новых прадпрыемстваў, але бярэ ў свае рукі ўжо існуючыя. Нярэдкі выпадкі, калі замежныя капіталісты, аўладаўшы польскім прадпрыемствам сыстэматычна яго разбураюць, каб адкрыць **польскі рынак для сваіх вырабаў.** Зараз, у сувязі з абвастрэньнем крызісу ў Польшчы, назіраюцца частыя выпадкі пераходу польскіх прадпрыемстваў у рукі замежнага капіталу.

Некаторы час таму назад бэльгійская фірма «Сосьетэ фінансьерэ індустрыэль Бэльго-Полонэз» **купіла акцыі буйное папяровае фабрыкі «Міркув»** (пад Варшавай). Гэтыя акцыі складаюць 60 проц. асноўнага капіталу фірмы. Той-жа бэльгійскі кансорцыум нядаўна аўладаў такімі **буйнымі металюргічнымі і паравозабудаўнічымі заводамі, як «Астравецкі завод» і фабрыка «Паравоз».**

У пачатку сьнежня ў рукі амэрыканскага капіталу перайшоў **буйны вагонабудаўнічы завод «Лільпоп Рау і Левэнштэйн»** у Варшаве. Удзельнікамі ўмовы былі, з аднаго боку, праўленьне акцыянэрнага таварыства, якое ўладала гэтым заводам і польскае міністэрства ліяхоў эносін, а- адругога боку — амэрыканскі кансорцыум «Стандарт Стрыт Кар Карпорэйшн». Амэрыканцы набылі 50 проц. акцый гэтага таварыства і, такім чынам, атрымалі рашучую перавагу над польскім банкам, бо большая часьць рэшты 50 проц. акцый распылена сярод дробных трымальнікаў, у той час, як амэрыканцы складаюць маналітную сілу. Карыстаючыся нізкім курсам акцый заводу, амэрыканцы купілі фактычна іх за бясцэнак (за 8.432.000 злотых, г. зн. менш, чым мільён даляраў). Удзел польскага ўраду ў гэтай зьдзелцы выявіўся ў тым, што ён заключыў 7-га сьнежня з новым праўленьнем таварыства дагавор аб пастаўцы заводам для польскіх чыгунак у працягу 7 год 14.000 таварных і 1.000 пасажырскіх вагонаў. Польскія чыгункі абавязаліся плаціць за гэтыя вагоны ў працягу 10 год. Фінансаваць названую ўмову будуць амэрыканцы.

У сьнежні ў рукі замежнага капіталу перайшла таксама **польская электратэхнічная фабрыка: «Брыгэвіч, Цукэртыва».** Фабрыка куплена бэльгійскай фірмай: «Атэлье дэ Канструкцыён Электрык дэ Шарльруа». Асабліва на надзвычай кабальных умовах нададзены польскім урадам цэлы рад канцэсій амэрыканскаму фінансаваму каралю Гарыману.

Нават фашысцкі друк прызнае, што гэтыя **канцэсіі абарачаюць Польшчу ў калёніяльны край і што ўсьлед за гаспадарчымі канцэсіямі прыйдзе таксама і палітычная залежнасьць.**

«Газэта Варшавска» ў сувязі з гэтым піша: «Увядзеньне чужога капіталу ў такім шырокім маштабе і з такімі вялікімі поўнамоцтвамі павінна таксама ўскладніць сацыяльнае становішча ў Польшчы». «Кур'ер Паранны» кажа:

«Калі замежны капітал праскае ў Польшчу для таго, каб стварыць новыя прадпрыемствы, дык гэта можна было-б лічыць станоўчым зьявішчам (пры ўмове, што ён ня будзе весьці драпежніцкае палітыкі). Але калі замежныя капіталы аўладаюць (часта за бясцэнак) старымі прадпрыемствамі, якія добра разьвіваюцца і маюць для краю буйное гаспадарчае значэньне, дык гэты факт нельга лічыць станоўчым і трэба апэляваць да польскіх акцыянэраў, каб яны не прадавалі вельмі двузначна сваіх акцый».

«Кур'ер Варшаўскі» называе такую форму ўкараненьня замежнага капіталу «распродажам» Польшчы і дае наступны сумны малюнак:

«Пераход маемасьці ў рукі чужаземцаў, страта ўплыву на вытворчасьць, давядзеньне палякаў да ролі наемнае сілы, а ў будучым аб'яднаньне нацыянальнае праблемы з сацыяльнай, г. зн. супроць уласьнікаў - чужаземцаў выступяць рабочыя - палякі».

Вось якія вельмі сумныя пэрспэктывы малюе польская прэса ў IV годзе фашысцкай дыктатуры Пілсудскага.

А. Р.

Гібель Эйэльсона і Борлянда—факт бясспрэчны

МАСКВА, 4. Арктычная камісія атрымала акт аб пошуках амэрыканскіх лётнікаў. У гэтым акце гаворыцца, што 26 студзеня амэрыканскі пілёт Кросон выкрыў па цені на сьнегу крыло самалёта.

Па распараджэньні капітана Мілаўзорава і пана Кросона былі пачаты раскопкі. 29 студзеня на мыс «Северный» прыляцелі лётнікі Сьліннёў і Голышаў для пошукаў Эйэльсона і вывазу пасажыраў «Ставропаля». 30 студзеня Кросон і Сьліннёў зрабілі палёт на лёгкім разьведачным амэрыканскім самалёце і агледзелі месца катастрофы (пасадка няжкіх самалётаў тут немагчыма). Самалёт Эйэльсона знойдзен моцна разьбітым. Пілёцкая кабіна разьбіта. Уся машына раскідана на плошчы ў 100 мэтраў, пакрыўлена і засыпана глыбокім сьнегам. Адкопаны рэвальвэр Эйэльсона, сплюшчаныя бідоны з-пад бэнзэны і мяшок ад цукру.

Капітан Мілаўзораў, начальнік лётнага зьвяна Сьліннёў, начальнік пагранічнага атраду Кучма, амэрыканскі лётнік Кросон і старшы амэрыканскі лётнік Чундаф прызналі, што **гібель Эйэльсона і Борлянда—факт бясспрэчны.** Месца катастрофы сфатаграфавана. Трупы спадзяюцца адкапаць на працягу месяца, калі яны не разарваны дзікімі **зьвярамі.**

Мо Дэ-гуй—прадстаўнік нанкінскага ўраду на савецка-кітайскай канфэрэнцыі

ТОКІЁ, 3. Агэнцтва «Дэмпо Цусін» паведамляе з Нанкіна, што нанкінскі ўрад пастанавіў ухваліць савецка - мукденскае паразуменьне, падпісанае ў Хабараўску. Адначасова нанкінскі ўрад назначыў Мо Дэ-гуя сваім прадстаўніком на Маскоўскую савецка - кітайскую канфэрэнцыю.

Крызіс у ПАЗШ без адзнак паляпшэньня

НЬЮ-ЁРК, 3. Эканамічны крызіс ПАЗШ праходзіць пры поўнай адсутнасьці адзнак паляпшэньня эканамічнае канюнктуры. Прадукцыя сталі, цэйнае прамысловасьці, якая некаль павялічылася, складае ў сучасны момант толькі 75 проц. магчымае поўнае нагрузкі. Аб'ём будаўніцтва ў сучасны момант дазёна меншы, чым у мінулым годзе.

Аб парадку пагашэньня запазычанасьці па ссудах пры ўступленьні ў калгасы

Пастанова Савету Народных Камісараў СССР

Савет Народных Камісараў СССР пастанаўляе:

1. Індывідуальныя сялянскія гаспадаркі, (у тым ліку і тыя, якія зьяўляюцца членамі с.-г. вытворчых т-ваў), якія ўступаюць у калектыўную гаспадарку абавязаны пагасіць усю сваю запазычанасьць с.-г. крэдытным т-вам за кошт плацяжоў, тэрміны якіх прайшлі да афармленьня ўступленьня ў калгас.

2. Калі індывідуальныя сялянскія гаспадаркі не пагасяць дабраахвотна паказаную запазычанасьць да ўступленьня ў калгас, дык яна спаганяецца прымусова ў парадку, устаноўленым законадаўствам Саюзных рэспублік.

3. Прымусовае спагнаньне ня можа быць распаўсюджана на сродкі вытворчасьці, якія перадаюцца ў калектыўную гаспадарку. Калі ў індывідуальнай гаспадарцы няма або калі іншая маемасьць, на якую можа быць распаўсюджана прымусовае спагнаньне, невыстарчальная, дык калгас бярэ на сябе пакрыцьцё запазычанасьці. У межах кошту сродкаў вытворчасьці, пераданых калгасу, гэта запазычанасьць пагашаецца за кошт агульных сродкаў калектыўнае гаспадаркі. Калі кошт сродкаў вытворчасьці, пераданых калгасу, меншы за суму запазычанасьці, дык розьніца пакрываецца калектыўнай гаспадаркаю за кошт асабістых даходаў членаў адпаведнай індывідуальнай гаспадаркі, якія ўступілі ў калгас. Тэрміны пакрыцьця запазычанасьці калектыўнымі гаспадаркамі ўстанаўліваюцца с.-г. крэдытным або вытворчым т-вам пасьля афармленьня калгасам. Адтэрміноваьні ўстанаўліваюцца рэспубліканскімі, а ў РСФСР—абласнымі (краявымі) канторамі Усесаюзнага с.-г. каапэрацыйна-калгаснага банку.

4. Запазычанасьць індывідуальнай гаспадаркі, якая ўступае ў калгас, с.-г. крэдытному і вытворчаму т-вам па ссудах, тэрмін плацяжу якіх наступае пасьля ўступленьня гэтае гаспадаркі ў калгас, пераходзіць на калектыўную га

Перашкоды на шляху выканаўня прамфінпляну

ТАМ, ДЗЕ АБ РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ НЯ ЧУВАЦЬ

Біць па канкрэтных недахопах у рабоце

Галавацяпская пабудова

5 ПЕРАСАДАК АДНЭЙ КАЛОДЫ

(Лесазавод «Праца», Пасталы, Мазыршчына)

Для дастаўкі лесаматар'ялу на лесазавод «Праца» ў 1929 г. была праложана чыгуначная ветка, даўжынёю ў 20 кілёмэтраў. Пабудова веткі, паводле меркаваньняў Лесбелу, павінна была мець вялікае значэньне ў сэнсе эканоміі гужавое сілы, патрэбнае загружанасьці заводу сырцом і патанценьня сабекошту падвозу лесаматар'ялу. Але шырокія пляны Лесбелу не апраўдаліся. Вузкакалейную ветку правялі не ад прыстані заводу, куды падвозіцца ды складаецца лесаматар'ял, а ад чыгуначнай веткі на адлегласьці 12 кілёмэтраў ад заводу, правёўшы другі канец вузкакалейкі ў лясны масыў да рэчкі Арэсы. Здавалася-б, ня дрэнна. Але справа ў тым, што канчатковы пункт вузкакалейкі, з прычыны балоцістага грунту, не даведзены да рэчкі Арэсы на 4 кілёмэтры. Раней лесаматар'ял на фурманках прывозіўся з лясного масыву проста на завод. А зараз гэты лесаматар'ял мае 5 наступных «перасадак»: лесаматар'ял перавозіцца на фурманках з лясного масыву да вузкакалейкі, потым гэты лесаматар'ял перагружаецца на пляцформы вузкакалейкі і перавозіцца да чыгункі. Ад вузкакалейкі лесаматар'ял да чыгункі перавозіцца таксама на фурманках. Пасьля гэтага лесаматар'ялы перавозяцца на прыстань заводу чыгункаю, а з прыстані зноў перагружаюцца на вузкакалейку ды падвозяцца да самага заводу. Такім чынам, усе лесаматар'ялы праходзяць 5 перагрузак. Адначасова пры перагрузках на кару бярвеньняў паленпасьцца шмат пяску і розпага бруду, які пры расьпілоўцы псуе дасціпільныя варштаты і вельмі дрэнна адбіваецца на прадукцыйнасьці працы і выклікае цэлы рад незадавальненьняў з боку рабочых.

Перад пачаткам работ была склікана вытворчая нарада, на якой рабочыя прапанавалі пабудаваць вузкакалейку ад рэчкі Арэсы да самага заводу, каб лесаматар'ялы прывозіліся паравозам з прыстані на завод бяз усякіх перагрузак. Але прапановы рабочых ня былі прынятыя пад увагу. На пабудову вузкакалейкі затрачана 285 тыс. рублёў, а карысьці з гэтага ні на грош. Завод на дастаўку лесаматар'ялу траціць вялікія сумы грошай, рабочыя хвалююцца такою пастаноўкаю справы, не задаволены гэтымі парадкамі і такую пабудову вузкакалейкі называюць шкодніцтвам.

Хто-ж зацікавіцца гэтым пытаньнем?

І. І.

Бяспрытульная

(Ф-ка утылізацыі, Менск)

Рызьбё і іншыя адкіды, як імпартны сырац, асабліва ў сучасны момант, пры шпаркім тэмпе выканаўня пяцігадовага пляну, набываюць вялізарнае значэньне.

Аб каштоўнасьці рызьбя зараз гаварыць ня прыходзіцца. Гэта ўжо ўсім добра вядома, але трэба заваструць увагу адпаведных арганізацый на апрацоўцы рызьбя.

Яшчэ ў мінулым годзе пытаньне апрацоўкі адкідаў паўстала ва ўсю шырыню. У сакавіку месяцы 1929 году быў складзены план пабудовы новай фабрыкі ўтылізацыі з такім разьлікам, каб фабрыка пачала працаваць у лістападзе м-цы, а да сталага пуску ф-кі арганізавалі працалекцыю у прыгарадным раёне «Тры Карчмы». У працалектыве было занята 60 рабочых.

Здавалася, што работа на апрацоўцы рызьбя паладзілася і засталося толькі пытаньне свячасовай пабудовы фабрыкі. Але па нейкай нядбайнасьці ці злой волі пабудова фабрыкі пачалася ня ў вызначаны тэрмін і да лістапада яна ня была скончана. Паўстала пытаньне ўжо не аб разгортваньні работы працалектыву, а аб ліквідацыі, бо з надыходам зімы ў непрыстасаваным памяшканьні працаваць работу нельга было. 35 чалавек рабочых скарацілі, а рэшту перакінулі ў іншы працалектыў.

Пасьля гэтага, ня скончыўшы пабудову новай фабрыкі набралі 40 рабочых і паслалі іх працаваць в 15-та студзеня. Сушылка — галоўная частка фабрыкі — аказалася дрэнна пабудаванай. Адна печка праз некалькі дзён увалілася. Пра невялічкую дробязь, якая ў сушылцы мае вялікае значэньне (вяроўкі для сушкі рызьбя) — забыліся.

Перабудова і абсталяваньне робіцца ў часе работы, а 40 чалавек рабочых на працягу двух тыдняў нічога ня робяць, перакідаюць рызьбё з месца на месца, дарам грошы атрымліваюць і нават ня ведаюць, на якіх умовах працуюць.

Кіраўніком зьяўляецца намочнік майстра, які адзін з работай справіцца ня можа, а загадчыка ўсё назначаюць.

Сярод рабочых ад бязьдзейнасьці нагадзецца антысэмітызм і хуліганства. Партыйная і прафэсыянальная арганізацыі адсутнічаюць, вылучылі аднаго прафупоўнаважанага, але ён ня ведае, што рабіць.

Наогул трэба адзначыць, што пабудаваная фабрыка пакуль што зьяўляецца бяспрытульнаю і награжае зрывам пляну імпарту сырцу-рызьбя.

РСІ патрэбна зацікавіцца новай фабрыкай.

Н.

Ударнікаў не інфармуюць аб ходзе сацспаборніцтва

(„Чырвоны Кастрычнік", Мазыр)

Прамфінпляп па фабрыцы «Чырвоны Кастрычнік» ня выкананы таму, што вакол гэтага пытаньня ня была даволі згуртавана грамадзкая ўвага. Ня гледзячы на тое, што на фабрыцы арганізавана 21 ударная брыгада, брыгадамі ахоплена да 180 чалавек (58 проц. агульнага ліку рабочых). Ударнікам да гэтага часу ня даны канкрэтныя заданьні. Аб месячных калькуляцыях і паказальніках, аб дасягненьнях і недахопах рабочых не інфармуюць. Усё гэта спрыяла невыкананьню прамфінпляну.

Значна паменшылася выпрацоўка першага-гатуновай фанэры і павялічыўся выпуск браку. Меркавалася давесьці процант браку да 0,1 проц., фактычна ёсьць 0,16 проц. Павялічыўся агульны выдатак сырцу, альбуміну. Прадукцыйнасьць працы ў параўнаньні з прамфінпляпам дала зьніжэньне на 11,8 проц.

Калі ў мінулым годзе на фабрыцы зусім ня было прагулаў на пятгрунтоўных прычынах, то ў гэтым годзе за першыя два месяцы ёсьць 28 прагулаў на пятгрунтоўных прычынах. І што яшчэ горш—24 прагулы падаюць на выхад на работу ў рэлігійныя дні.

М. ВАПЕЛЬНІК.

Ня вылазяць з дэфіцыту

(Каўбасныя фабрыкі Белмясгандлю)

Два месяцы назад у Белмясгандлі узліся дзьве каўбасныя арцелі—інвалідная і саматужная «Труженик». Агульны сход рабочых усіх трох фабрык пастанавіў абвясьціць сябе ўдарнымі. Але фабрыкі да гэтага часу не працуюць паўдарнаму. Ня гледзячы на перапыканьне вытворчай праграмы на 6 проц, фабрыкі за апошнія два месяцы далі каля 18.000 руб. дэфіцыту, што складае 2½ проц.

Прычыны—адсутнасьць кіраўніцтва сацыялістычным спаборніцтвам, рост прагулаў і спазьненьняў, слабая работа пасьцегазэты, адсутнасьць улікі недахопаў і дасягненьняў, адсутнасьць увагі да пытаньняў рацыяналізацыі.

Партыйныя і камсамольскія ячэйкі Белмясгандлю, якім у першую чаргу трэба было-б узяцца за ўпарадкаваньне работы на фабрыках, за выкананьне прамфінпляну—гэтай работы не вядуць.

А. М.

ПАЛЬНА ПРАВЯРАЙЦЕ ПАРТЫЙНЫЯ РАДЫ

Хроніка росту і чысткі партыі

8 рабочых саўтасаў **Вусьце** (Аршаншчына) калектыўна ўступілі ў рады партыі. Большасьць рабочых мае вялікі вытворчы стаж. Напрыклад, т. Кулікоў, батрак, 30 год працуе на найме і зьяўляецца прыкладным саўтаскім рабочым.

Д.

* * *

У **Рагачэўскім раёне** (Бабруйшчына) звыш 50 с.-г. рабочых, работніц, батракоў і беднякоў-калгаснікаў у ленінскія дні падалі заявы аб прыёме ў партыю.

Ш.

* * *

Скончана праверка парт'ячэйкі дэпо **ст. Менск.** Чыстка паказала, што ячэйка слаба праводзіла палітвыхаваўчую работу. Асобныя партыйцы ў часе чысткі паказалі ня здолелі адказаць на такія пытаньні, як, што такое УсеЦКСМ, НЭП і г. д. У часе чысткі слаба была разгорнута самакрытыка. Асобныя партыйцы імкнуліся змазаць недахопы ў рабоце ячэйкі. Ня гледзячы на гэта, праверкам здолеў выявіць сапраўдны стан парт'ячэйкі. 10 чал. за розныя антыпартыйныя ўчынкі выключаны з радоў КП(б)Б. На іх месца 50 рабочых ад варштату падалі заявы аб уступленьні ў партыю.

В. М.

* * *

У часе чысткі ячэйкі КП(б)Б **палаты мер і вагі** (Менск) выкрыты факты п'янства асобных камуністых, заціску самакрытыкі і г. д. Побач з гэтым высьвятляецца, што частка членаў ячэйкі палітычна літаральна нянісьменная.

Ш—ў.

* * *

Як паказала чыстка парт'ячэйкі **ст. Ворша,** бюро ячэйкі зусім не кіравала сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарным рухам. Ячэйка не разгарнула барацьбы са шкодніцтвам на чыгунцы, не заўважыўшы, як група антысавецкіх элемэнтаў на ст. Ворша сыстэматычна займалася шкодніцтвам. Са складу ячэйкі 10 чал. выключана з партыі. Сярод іх Васільлеў у мінулым быў на службе ў генэрала Дзянікіна.

Лагун.

* * *

Шырока разгарнулася праверка і чыстка парт'ячэйкі пры будаўніцтве **мяснога камбінату** (г. Ворша). Першыя дні чысткі паказалі, што ячэйка зусім слаба займалася гаспадарчымі пытаньнямі. Бюро ячэйкі не змагалася з п'янствам і рвацкімі непралетарскімі настроямі асобных партыйцаў. Крытыка і самакрытыка ў ячэйцы не разгорнута. На справаздачы бюро ячэйкі на праверачным сходзе выступіў толькі адзін беспартыйны рабочы ў той час, калі на будаўніцтве працуе 300 будаўнікоў.

Лапінскі.

* * *

У сваім справаздачным дакладзе на чыстцы ячэйкі заводу **«Чырвоная Зара»** (Менск), сакратар парт'ячэйкі больш гаварыў аб тым, што зрабіла адміністрацыя, замест таго, каб паказаць на канкрэтныя дасягненьні і недахопы ў практыцы ячэйкі. Між тым, побач з відавочнымі дасягненьнямі, у ячэйцы ёсьць вялікія недахопы. Асобныя члены ў наддагаворную кампанію падтрымывалі рвацкія занатрабаваньні часткі рабочых. **У прасоначным аддзяленьні партыйцы доўгі час адмаўляліся ўступаць у сацыялістычнае спаборніцтва.** Бюро ячэйкі зусім слаба кіравала сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарнымі брыгадамі.

А. М.

* * *

Чыстка ячэйкі Эльводу (Менск) праходзіць пры актыўным удзеле беспартыйных рабочых і работніц. У часе чысткі высьветлілася, што сакратар партыйнай ячэйкі ў мінулым служыў у царскай турме (быў турэмным нагладчыкам). Трэба спадзявацца, што чыстка выкрые ўсіх тых, хто выпадкова трапіў у рады партыі.

Х—цар.

Палітычнае банкруцтва кіраўніцтва БДВ

Рэзалюцыя бюро Менскага Акругкому КП(б)Б

Заслухаўшы паведамленьне Фрунзаўскага РК КП(б)Б аб правядзеньні юбілею Белдзяржвыдавецтвам, Бюро АК і Прэзыдыум АКК адзначаюць, што РК КП(б)Б рашуча і своячасова рэагараў па дапушчаныя пры сьвяткаваньні юбілею палітычныя памылкі і даў ім правільную палітычную ацэнку.

1. Ва ўмовах абвостранае клясавае барацьбы, напружанага сацыялістычнага будаўніцтва, рашучага змаганьня з адхіленьнямі ад генэральнае лініі партыі, у асабліваасьці з правым ухілам, прымірэнцтвам да яго і нацыянал-апартунізмам, адной з адмен правага ўхілу, а таксама барацьбы з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, як найбольш небясьпечным на даным этапе, — выдавецкая дзейнасьць БДВ набывае асаблівае важнае палітычнае значэньне, як моцнае зброі камуністычнае партыі ў справе мабілізацыі мас вакол сацыялістычнага будаўніцтва.

У зьвязку з гэтым сьвяткаваньне 5-цігадовага юбілею БДВ павінна было набыць вялікі грамадзка-палітычны характар, як гэта і было прадугледжана спэцыяльнай дырэктывай ЦК КП(б)Б, і зьявіцца пачаткам стварэньня адсутнічаўшай да гэтага часу шчыльнай, штодзённай сувязі з рабочай клясай, уцягненьня ўсе пралетарскае грамадзкасьці ў жорсткую крытыку, як папярэдніх палітычных прарываў у выдавецкай дзейнасьці БДВ, гэтак і сучасных выдавецкіх плянаў.

2. Уся КП(б)Б і Менская партарганізацыя, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, праводзіць рашучую барацьбу з нацыянал-дэмакратызмам, мабілізуючы вакол гэтае барацьбы ўсю партыйную арганізацыю і рабочыя масы. БДВ, у дзейнасьці якога ў мінулым меў месца цэлы рад значных палітычных прарываў, у прыватнасьці праяўленьняў нацыянал-дэмакратызму (выданьне кніжак «Падарожжа на новую зямлю», «Маладая Беларусь» і інш.), павінна было ўлічыць у сваёй далейшай дзейнасьці вышэйпаказаныя прарывы і стаць на шлях рашучага асуджэньня і выпраўленьня гэтых буйнейшых памылак. Але-ж праведзены 5-цігадовы юбілей Белдзяржвыдавецтвам паказвае, што кіраўніцтва БДВ ня толькі ня стала на шлях рашучага выпраўленьня сваіх памылак, а наадварот свае памылкі ў часе падрыхтоўчае працы і на самым урачыстым вечары аб'ектыўна зрабіла дэманстрацыю супроць барацьбы ўсёй КП(б)Б і Менскай партарганізацыі з нац.-дэмакратызмам.

Вышэйпаказанае сьведчыць аб тым, што памылкі, дапушчаныя ў часе сьвяткаваньня 5-цігадовага юбілею БДВ, зьяўляюцца не выпадковымі, а лёгічным працягам раней'шых палітычных памылак БДВ.

3. У падрыхтоўку да юбілею БДВ 1 яго правядзеньня ня была ўцягнута Менская партарганізацыя, таксама ня былі ўцягнуты шырокія рабочыя масы. Партыстка БДВ не паставіла пытаньня аб падрыхтоўцы да юбілею перад Мен. АК і ЦСПСБ, даклады БДВ ня былі пастаўлены на рабочых сходах па прадпрыемствах. Вышэйпералічаныя абставіны прывялі да палітычнага правалу юбілею БДВ.

4. У часе самога правядзеньня мелі мейсца факты, якія, у сувязі з раней'шымі палітычнымі памылкамі БДВ, в асаблівай выразнасьцю падкрэсьлілі палітычную няздольнасьць кіраўніцтва праўленьня БДВ у нэрыад рашучага наступленьня сацыялістычных элемэнтаў і абвастрэньня клясавай барацьбы.

Уступная прамова загадчыка БДВ тав. Шышлы на ўрачыстым насяджэньні 28-га студзеня, была зусім палітычна нявытрыманая, ня было выпуклена значэньне пралетарскае літаратуры, ні слова ня было сказана аб барацьбе з нацыянал - дэмакратызмам і не пабальшавіцку былі раскрытыкаваны буйныя палітычныя памылкі, якія мелі мейсца ў дзейнасьці БДВ.

5. Кіраўніцтва БДВ сьвядома перадаверыла практычнае ажыцьцяўленьне раду мерапрыемстваў, зьвязаных з дарыхтоўкаю ўрачыстага вечару, супрацоўнікам БДВ Ламаку і Адзярыху, варожапалітычная фізіяномія якіх відома праз друк пралетарскае грамадзкасьці і, зразумела, была вядома і кіраўніцтву БДВ, у выніку чаго нельга лічыць выпадковаю адсутнасьць на сцэне ў часе ўрачыстага насяджэньня партрэту Леніна, чырвоных сьцягаў, лёзунгаў аб ліквідацыі кулацтва, як клясы, аб пяцігодцы, аб барацьбе з нацыянал-дэмакратызмам і аб кіруючай ролі камуністычнае партыі і аб ролі пралетарскае літаратуры ў момант абвостранае клясавае барацьбы.

Дзякуючы такому перадаверю на ўрачыстым насяджэньні ня было рабочых, а разам з гэтым атрымалі магчымасьць і прысутнічалі вычышчаныя з БДВ асобы, як Ільлюшонак і г. д., і наогул аўдыторыя не прадстаўляла сабою пралетарскае грамадзкасьці і нават было адмоўлена ў допуску па ўрачыстае насяджэньне членам пленуму Менскага АК, які ў той час адбываўся.

6. Пры складаньні прэзыдыуму ня было ўлічана ўключэньне Бюро Менскага АК КП(б)Б, прадстаўнік АК быў уведзен у прэзыдыум пасьля пачатку насяджэньня і толькі пасьля спэцыяльнага напамінку сакратара яч. тав. Курціка.

7. Зьмест урачыстага насяджэньня, за выключэньнем прамоў прадстаўнікоў ЦК КП(б)Б, ня быў падпарадкаваны задачам барацьбы за клясавую вытрымасьць выдаваемае БДВ прадукцыі, за выпраўленьне дапушчаных раней палітычных памылак, рашучай барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам і выкананьню пралетарскай літаратурай задач, якія ўскладаюцца на яе камуністычнай партыяй і рабочай клясай у нэрыад сацыялістычнае рэканструкцыі.

8. Ячэйкай БДВ дапушчана значная палітычная памылка ў тым, што яна ня ўдзельнічала ў папярэдний падрыхтоўцы і ў самым правядзеньні юбілею, што ўскладае адказнасьць за памылкі таксама і на ячэйку. Разам з гэтым Бюро АК і Прэзыдыум АКК адзначаюць, што ячэйка зараз-жа і рашуча рэагавала на дапушчаныя памылкі і падала ацэнцы іх правільны палітычны характар.

На падставе вышэйпаказанага, Бюро АК і Прэзыдыум АКК пастанаўляюць:

1. Лічыць неабходным тэрмінова зьмяніць палітычна збанкрутаваўшае кіраўніцтва БДВ, аб чым паставіць пытаньне перад ЦК КП(б)Б.

2. Праверкому і АКК, у тэрміновым парадку, разгледзець пытаньне аб прыцягненьні да пэрсанальнае партыйнае адказнасьці вінаватых у памылках.

3. АКК РСІ, у тэрміновым парадку, правесьці чыстку апарату БДВ з пункту погляду рашучага арабочаньня апарату і камунізацыі найбольш адказных участкаў работы выдавецтва.

Гэтую пастанову апублікаваць у друку.

Усебеларуская аргнарада пры ЦК КП(б)Б

Аб паляпшэньні сыстэмы вылучэньня

У сваім дакладзе аб перабудове і паляпшэньні сыстэмы вылучэньня і падрыхтоўкі вылучэнцаў т. **Танхілевіч** закранае выключна практычныя моманты пытаньня.

Сыстэма вылучэньня і падрыхтоўка вылучэнцаў мае рад буйнейшых недахопаў: бясплянасьць пры падборы, бяссыстэмнае скарыстаньне вылучаных, бюракратызм пры вылучэньні, дрэнна настаўленая падрыхтоўка вылучэнцаў і часамі адрыў іх ад рабочых мас.

Якія-ж задачы стаяць у галіне перабудовы сыстэмы вылучэньня і падрыхтоўкі вылучэнцаў?

Справу непасрэднага падбору і падрыхтоўкі вылучэнцаў трэба перадаць у першую чаргу прафсаюзным арганізацыям, а таксама камсамольскім, савецкім, каапэрацыйным і гаспадарчым. На іх ускладаецца адказнасьць за своячасовае і поўнае ўзмацненьне сваіх апаратаў за лік вылучэнцаў.

Падрыхтоўка кадраў вылучэнцаў павінна мець мэтавы характар. Прафсаюзы, саветы, каапэрацыя сыстэматычна падрыхтоўваюць папаўненьне вылучэнцамі сваіх арганізацый з ліку свайго актыву і адначасова вядуць падрыхтоўку вылучэнцаў і для іншых галін сацыялістычнага будаўніцтва. Вылучэньне польга ні ў якім разе праводзіць габінэтным парадкам, трэба, каб кандыдатуры вылучэнцаў зацьвярджаліся на сходах рабочых.

Для таго, каб дабіцца плянавасьці ў вылучэньні і дасягнуць лепшай падрыхтоўкі вылучэнцаў, кожная арганізацыя павінна заўсёды мець улік тых работ, на якіх трэба скарыстаць вылучэнцаў.

Характар нагрузак вылучэнца павінен дапамагаць яго лепшай падрыхтоўцы на тэй рабоце, на якую ён вылучаны, нельга перагружаць вылучэнцаў абавязкамі, якія непасрэдна ня зьвязаны з яго работай.

Трэба спыніць частыя перакідваньні вылучэнцаў, замацоўваючы іх на тэй рабоце, на якую яны вылучаны, ня менш, як на 2-3 гады.

Для лепшай падрыхтоўкі вылучэнцаў трэба сыстэматычна азнаямляць таварышоў, залічаных у рэзэрвы для вылучэньня з характарам работы тэй арганізацыі, дзе яны будуць працаваць. Гэта дасягнецца шляхам удзелу ў насяджэньнях, канфэрэнцыях, выкананьня асобных даручэньняў, прымацаваньня вылучэнцаў да больш падрыхтаваных работнікаў гэтых арганізацый **праз утварэньне групавога навучаньня і г. д.**

Мэтад рабочага шэфства **над дзяржаўным, каапэрацыйным і гаспадарчым** апаратамі трэба максымальна пашырыць. Рабочае шэфства забясьпечыць рэальную магчымасьць узмацненьня савецкага апарату за лік вылучэнцаў-рабочых.

Тав. Танхілевіч заварастрае ўвагу на неабходнасьць рашучай барацьбы з выпадкамі супраціўленьня арабочаньню апаратаў, з перашкодамі справе вылучэньня. У адказ на гэта трэба пашырыць вылучэньне новых тысяч камуністых-рабочых, батракоў, бяднякоў ва усе арганізацыі. Пры гэтым трэба канчаткова выжыць недаацэнку вылучэньня жанчын работніц, батрачак і бяднячак.

Партыйныя камітэты, вызваліўшыся ад непасрэднае работы на вылучэньні, павінны ўзмацніць агульнае кіраўніцтва гэтай работай.

У **спрэчках** на дакладу т. Танхілевіча выказаўся рад таварышоў.

Тав. **Вэндэ** (Гомель) прапануе вылучыць для забясьпячэньня пралетарскага ядра ў сельсаветах пэўную колькасьць рабочых - камуністых. І ён лічыць, што да гэтага часу слаба праводзілася вылучэньне камсамольцаў, батрацкай і бядняцкай моладзі.

Тав. **Крэмэр** (ЦК КП(б)Б). Да гэтага часу ніякай сыстэмы ў вылучэньні ня было. Вылучэньне праводзілася кампанейскім парадкам у «сьвяточныя дні». Тав. Крэмэр зварачае ўвагу нарады на канкрэтныя выпадкі недапушчальных адносін да справы вылучэньня жанчын-работніц, батрачак і бяднячак. З 100 старшынь сельсаветаў жанчын, якія былі выбраны ў мінулай перавыбарчай кампаніі, засталося на працы менш паловы, а з 8 старшынь РВК жанчын не засталося ні адной. Вылучэньне камсамолак праводзіцца слаба. Ёсьць добрыя кадры камсамолак, якія можна было-б вылучыць на розныя галіны работы, але пра іх часамі нават і ня ведаюць. Тав. Крэмэр падае факты абураючых адносін нават асобных сакратароў РК да работы вылучэнак-жанчын, факты дыскрэдытаваньня вылучэнак з мэтай зьняць іх з работы (Гомельшчына, Магілёўшчына). Па такіх фактах трэба моцна біць, каб не дапускаць больш іх паўтарэньня.

Тав. **Гантман** у сваім выступленьні спыняецца на асобных пытаньнях, закранутых у спрэчках. Калі вылучэнец зрабіў памылку, — кажа т. Гантман,— за гэта яго зьнімаць нельга з работы, трэба яму на гэтыя памылкі паказаць, дапамагчы зразумець гэтыя памылкі, навучыць яго больш із не паўтараць. Калі-ж вылучэнец скажае клясавую лінію, то бязумоўна рабочая класа, адкуль ён вылучаны, павінна яго адклікаць.

Кожнае прадпрыемства павінна мець асобнае заданьне, колькі куды вылучэнцаў трэба падрыхтаваць. Нам, бадай, прыдзецца ўжываць мэтад прапановы тэй ці іншай **арганізацыі** павысіць на пэўны процант рабочых у сваім апараце, а потым пранярваць, як выканана гэта наша дырэктыва.

Прафсаюзы павінны адказваць за агульную падрыхтоўку і выхаваньне вылучэнцаў.

У сельсаветы нам прыдзецца вылучыць, як і ў калгасы, пэўную колькасьць рабочых, але ня трэба забываць аб узмацненьні саветаў і за лік батрацтва, с.-г. рабочых і бедноты. Трэба іх рыхтаваць, трэба на іх ўзяць курс. А гэта работа яшчэ кульгае. Вялікі актыў с.-г. рабочых, батракоў і беднякоў по выкарыстоўваецца.

Тав. **Чарнушэвіч** (Віцебск). Пры вылучэньні краліфікаваных рабочых трэба дабіцца захаваньня разьмеру зарплаты ня ніжэй тэй, якую ён атрымліваў на вытворчасьці. Трэба дабіцца перадому ў пытаньні вылучэньня беспартыйных рабочых. Да гэтага часу вылучэньне беспартыйных было невыстарчальнае.

Трэба даць загадзя кожнай акрузе памяцтаньні, колькі яна павінна падрыхтаваць вылучэнцаў для цэнтральных устаноў.

Тав. **Баль.** У нас былі вялікія прарывы ў справе вылучэньства (Наркамсабес і інш.). Гэта тлумачыцца дрэннай сыстэмай вылучэньня, кампанейшчынай і г. д.

У гэтай рабоце. Нам трэба сурёзна ўзяцца за напраўленьне падрыхтоўку вылучэнцаў. У наступным годзе ў сувязі з разгортваньнем будаўніцтва прамысловасьці нам патрэбна будзе 150 т.т. дырэктароў заводаў і фабрык, начальнікаў будаўніцтва і г. д. Нам прыдзецца ўжо зараз пачынаць іх рыхтаваць. Акрамя таго, мы маем на ўвазе працусьціць на лініі спажывецкай каапэрацыі праз курсы 15.000 чал.

Хроніка нарады

Учора былі заслуханы даклад тав. **Гантмана** аб рэарганізацыі партыйнага апарату, даклад тав. **Гаруновіча** аб перабудове партыйнай работы на прадпрыемствах, даклад тав. **Міцькова** аб чарговых задачах партработы на вёсцы і сваклад тав. **Хацкевіча** аб палепшаньні і узмацненьні работы саветаў у сувязі з масавай калектывізацыяй.

Учора нарада вачынілася. Падрабязьні ў наступным нумары.

ЛЮТЫ—УДАРНЫ МЕСЯЦ ПА ЛЕСАЗАГАТОЎКАХ

Рашуча пакончыць з нядбайнасьцю у загатоўцы і вывазцы лесу

Да 1-га лютага вывезена толькі 17,2 проц. вызначанага заданьня

З 25.000 КУЛАЦКІХ ГАСПАДАРАК, ДА ГУЖПАВІННАСЬЦІ ПРЫЦЯГНУТА ТОЛЬКІ 800

Поўкасьцю выканаць пляны лесазагатовак

Асобнаўпоўнаважаны Эканомнарады па лесазагатоўках у БССР тав. **Грысэйч** паведаміў нашаму супрацоўніку аб ходзе загатовак.

— На 1-га лютага гадавы плян на загатоўках лесаматар'ялаў выканаў толькі на 61,2 проц. Вывезена лесаматар'ялаў да гэтага тэрміну толькі 17,2 проц. Яшчэ горш абстаіць справа з дрывамі, якіх загатоўлена 60,9 проц., а вывезена ўсяго толькі 15,4 проц.

На адным з апошніх месц па загатоўцы лесаматар'ялаў і вывазцы іх стаіць Барысаўскі раён, які выканаў гадавы плян загатовак толькі на 49,2 проц., а плян вывазкі — толькі на 11,2 проц. Горш з усіх округ праходзіць загатоўка дроў па Віцебшчыне, дзе гадавое заданьне па загатоўках выканана толькі на 43,9 проц., а вывезена ўсяго 12 проц.

Гэтыя лічбы сыгналізуюць аб дрэнным становішчы з загатоўкай і вывазкай лесу.

Зусім слаба да гэтага часу праводзіцца гужавая павіннасьць. Паводле вестак Наркамфіну, па БССР налічваецца звыш 25.000 гаспадарак, абкладзеных індывідуальна, якіх неабходна прыцягнуць да выкананьня гужавое павіннасьці. Але **на сёньнішні дзень да вывазкі лесу прыцягнута ўсяго толькі 800 кулацкіх фурманак.**

Аб тым, як выконваецца гужпавіннасьць кулацтвам, сьведчаць наступныя лічбы: у Полацкай акрузе працуе ўсяго 30 кулацкіх фурманак, у Бабруйскай — 100, у Барысаўскай — 60, у Магілёўскай — 59 і г. д.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што мясцовыя органы і грамадзкія арганізацыі **да гэтага часу фактычна зусім ня прыступілі да прыцягненьня кулацкіх гаспадарак да гужавое павіннасьці.**

Наогул, трэба адзначыць, што, ня гледзячы на рад дырэктыў партыі і ўраду, мясцовыя органы да гэтага часу яшчэ не зьвярнулі належнае ўвагі на справу загатовак і вывазкі лесу. Ёсьць ганебныя факты, калі некаторыя мясцовыя арганізацыі зусім адмаўляюцца прымаць удзел у загатоўках. Так, напрыклад, старшыня Вяляцкага сельсавету (Барысаўскага раёну), і старшыня КСУ (таго-ж раёну) лічаць, што лесазагатоўкі гэта ня іх справа. Зусім зразумела, што справа аб гэтых старшынях перадана ў пракуратуру для прыцягненьня да судовай адказнасьці.

Зараз санная дарога ўстанавілася амаль што па ўсёй Беларусі. Перад намі стаіць задача **максымальна скарыстаць гэту акалічнасьць і ўзмацніць вывазку загатоўленых лесаматар'ялаў і дроў.**

Для таго, каб поўнасьцю выканаць плян месячніка, трэба, каб у першую дэкаду лютага кожны дзень у нас працавала да 203 тыс. фурманак, у другую дэкаду — 242.000 фурманак, і ў трэцюю дэкаду — такая-ж колькасьць.

Адсюль ужо відны тыя вялікія задачы, якія стаяць перад партыйнымі, савецкімі і загатоўчымі арганізацыямі, па рашучым забясьпячэньні выкананьня пляну вывазкі і загатоўкі лесаматар'ялу. Павінны быць ужыты рашучыя меры да 100 проц. забясьпячэньня вывазкі лесу патрэбнай колькасьцю вазоў. **Як мага шырэй павінны быць прыцягнуты да вывазкі калгасьнікі, якія да гэтага часу прымаюць яшчэ слабы ўдзел у загатоўках.**

Да гэтага часу яшчэ не паладжана таксама бесьперабойнае забясьпячэньне лесарубаў і возчыкаў патрэбнымі прадуктамі. Каапэрацыя павінна паладзіць поўнае забясьпячэньне рабочых патрэбнымі таварамі.

Люты павінен стаць ударным месяцам на загатоўках і вывазцы лесу.

А.

ЯШЧЭ НЯМА ПЕРАЛОМУ Ў ВЫВАЗЦЫ ЛЕСУ

По даных Лесбелу на 1-га лютага гадавое заданьне па лесазагатоўках выкананa на 61,2 проц.

Лепш усяго праходзіць загатоўка лесаматар'ялаў па Магілёўскай акрузе, дзе выканана 78,7 проц. гадавога заданьня. На другім месцы—лесазагатоўчыя вучасткі Бабруйскае акругі, якія выканалі 68,6 проц. гадавога пляну.

Цягнуцца ў хвасьце Барысаўскі, Віцебскі і Полацкі лесазагатоўчыя вучасткі, якія загатовілі ад 49 да 55 проц. гадавога заданьня.

Такі-ж прыблізна малюнак і ў галіне загатоўкі дроў. Тут на 1-м месцы ідзе Мазыршчына. Адстаюць Полацкі, Віцебскі і Чэрвенскі вучасткі.

Сярэдні процант выкананьня гадавога заданьня па вывазцы лесаматар'ялаў—17,2. Здавальняюча праходзіць вывазка лесу ў Магілёўскім вучастку (35,5 проц.). Зусім слаба вывозяцца лесаматар'ялы з вучасткаў Полаччыны (6,8 проц.), Чэрвеньскага (6,6 проц.), Барысаўскага (11,1 проц.), Вузьдзенскага (11,5 проц.) раёнаў.

Амаль усюды не хапае возчыкаў. Наогул Лесбел забясьпечаны возчыкамі толькі ў разьмеры 24,7 проц. патрэбнае колькасьці. Найбольш спрыяюча стаіць справа ў Магілёўскім вучастку, дзе працуюць 65,4 проц. патрэбнае колькасьці возчыкаў. Вельмі мала возчыкаў на вучастках Бабруйскае акругі (15,5 проц.), Чэрвеньскага раёну (14,2 проц.), Полаччыны (17,8 проц.).

Лесарубы не забясьпечваюцца салам

Дырэктывы наркамгандлю ня выконваюцца

Тры разы—29-га кастрычніка, 14 га лістапада і 7-га сьнежня Наркамгандаль запрапанаваў Белмясгандлю, Белкаапсаюзу і Малочна-жывёлагадоўчаму саюзу забясьпечыць салам рабочых, занятых на лесазагатоўках. Былі вызначаны нормы выдачы на асобных арганізацыях і акругах.

Паводле вестак з месц, нізавыя арганізацыі зусім не зьвярнулі ўвагі на забясьпячэньне лесарубаў.

Зараз Наркамгандаль запрапанаваў усім арганізацыям праверыць, як выконваецца яго заданьне і дабіцца яго бязумоўнага і своячасовага выкананьня.

Трывожны сыгнал з Брагінскага раёну

Вывезена толькі 5 проц. загатоўленага лесу

Лесазагатоўкі і вывазка лесу ў Хойніцкім і Брагінскім раёнах праходзяць ва ўмовах **абвостранае клясавае барацьбы, упартага супраціўленьня кулацтва і нядбайных адносін мясцовых арганізацый да лесазагатовак.** Дырэктывы аб узмацненьні ўвагі да лесазагатовак або зусім ня выконваюцца, або выконваюцца вельмі кепска. Вось факты.

Хойніцкі райсаюз да апошняга дня не перабудаваў свайго апарату, ня прыстасаваў яго да таго, каб забясьпечыць лесарубаў і возчыкаў. Вялікабарскае і Амелькаўскае спажывецкія таварыствы адмовіліся выдаваць хлеб лесарубам. Фэнды прамтавараў, вызначаныя для забясьпячэньня лесазагатовак, ляжаць на складах і не выкарыстоўваюцца.

Зараз на лесараспрацоўках у Хойніцкім раёне працуюць 1000 лесарубаў, а паводле пляну павінна працаваць 2.600 чал. Але і гэта колькасьць лесарубаў вельмі дрэнна забясьпечана кватэрамі. У бараках зусім мала ложак. Лесарубам прыходзіцца спаць на падлозе. Культработа зусім адсутнічае.

У катастрафічным становішчы знаходзіцца вывазка лесу. Вось факты. Каб выканаць плян вывазкі, трэба штодзённа мець 9.900 падвод, **а працуюць усяго 1.200 падвод. Дагэтуль вывезена толькі 5 проц. усяго загатоўленага лесу.**

Зараз у Хойніцкім і Брагінскім раёнах працуюць рабочыя брыгады, якія вядуць растлумачальную работу сярод бядняцка-серадняцкіх мас вёскі. Для кожнае вёскі выпрацаваны кантрольныя лічбы вывазкі.

Усім кулаком пераданы абвесткі аб гужавой павіннасьці.

Ёсьць ужо факты, калі кулакі адмаўляюцца ад гужавое павіннасьці, **а мясцовыя органы не рэагуюць на гэта —яшчэ ня арыштаваны ні адзін кулак.**

Трэба адзначыць нядобрасумлен

Уваравіцкі раён суцэльнай калектывізацыі

НАРАДЖЭНЬНЕ ГІГАНТА

Год назад невялічкая група камуністых, былых партызан і беднякоў вёскі Радзеева, Лапіцкага сельсавету, Уваравіцкага раёну, Гомельскай акругі, заснавала сельска-гаспадарчую арцель імя Энгельса. Дзякуючы правільнаму правядзеньню клясавай палітыкі і сыстэматычнай рабоце з беднатой, арцельшчыкі хутка перацягнулі на свой бок усю беднату, а потым і серадняцкую масу вёскі. Рух мас узрастаў. Праз некалькі месяцаў увесь Лапіцкі сельсавет увайшоў у калгас, а сёньня „Энгельс" ахапіў восем сельсаветаў раёну і раскінуў свае прасторы на 30 тысяч гэктараў. Аб тым, як адбывалася гэтае нараджэньне гіганцкага калгасу ва ўмовах сібернай клясавай барацьбы, аб тым, як радзееўцы практычна правялі поўнае абагульненьне жывёлы, насеньня і інвэнтару, аб тым, як яны прыстасавалі пад агульныя хлявы гумны, выкарысталі рабочую сілу і вядуць барацьбу з разбазарваньнем маемасьці,—аб усім гэтым расказвае нарыс нашага спэцыяльнага карэспандэнта.

Вось яна, рэчаіснасьць...

Прастраленыя балаховіцкімі і ўрангельскімі кулямі радзееўскія беднякі закарылі ўсю гэту кашу. Сын пастуха Самойла Савельлеў, Даніла Барабанаў, што прайшоў усе франты, батрак Лапцееў, стрэлачнікаў сын — хатнік Мішка Карпенка, Цішчэнкі Сямён і Пятро, Зыблевы Мікола і Косьцік — усё галота, самая беднота, дымам і пажарам грамадзянскай вайны хрышчоныя хлапцы, — яны былі арганізатарамі калгасу «Энгельс».

Яшчэ выступаюць над тонкім сьнежным накрывалам чорныя рубцы сялянскіх меж — праз два месяцы іх зруйнуюць павекі.

Яшчэ зморана ўскідваюць крыльлямі кулацкія ветракі — заўтра іх канфіскуюць.

На 30.000 гэкт. раскідваюцца наваколь заваяваныя прасторы «Энгельса». 30.000 гэктараў, спрэс калектывізаваны ўвесь раён, узбуйнаванае мора клясавага змаганьня, бясконцыя сялянскія сходы і ўсё аб адным, бясконцыя ночы вясковага актыву, канфіскацыя кулацкага збожжа, жывёлы і маемасьці, грукат трыераў, сьпісы падлеглых высяленьню, рабочыя брыгады, сацспаборніцтва з клімавіцкімі калгасьнікамі, — вось яна, рэчаіснасьць.

— Хлопцы, от калі напіло!..

Самойла Савельлеў расьсякае кулаком паветра і нейкая слаўная дзіцячая ўсьмешка ўспыхвае ў ягоных вачох і кутках губ. Ці-ж ён і таварышы думалі аб такіх маштабах і справах яшчэ летась, калі яны засноўвалі ў Радзееве арцель «Энгельс» з 14 гаспадарак?

„Баранавы палянкі"

Супроць беднякоў і партызанаў былі Бараны — Хведар, Максім, Іван і Пілін — уладары ветракоў, алейніў і крупадзёрак ды разам з Баранамі Гаўрыла Жук, наставіўшы ў сябе нафтавы рухавік, і арандатар бядняцкіх палосак Іван Раманаў. Гэта была воўчая кулацкая зграя, разбагацеўшая яшчэ за царом на скупкі зямель у памешчыка Гармановіча. Зьдзелкі з пячугай — памешчыкам утвараліся хутка, вялізныя кавалкі пашы і сенажаці адыходзілі ў кулацкае ўладаньне — так яны і называліся, гэтыя кавалкі: «Баранавыя палянкі»...

Кулачо ў барацьбе супроць арцельшчыкаў выкарыстоўвала коснасьць і цемнату нянісьменнай вёскі, прайдзісьвет-папа і злосную тупую брахню, накшталт таго, што ў калгасах «баба агульная», а «старых адпраўляюць у Менск на мыла», ды акрамя таго «ўсім калгасьнікам ставяць на лоб кляймо».

Самойла Савельлеў, Лапцееў, Барысенка, Цішчэнкі і Зыблевы і ўсе тыя, хто былі з імі, сваім бокам адчулі кулацкую экспляатацыю. Гэта яны і іхнія жонкі адраблялі ў Бараноў па 6 дзён у жніво за пазычаны ўзімку пудзік збожжа. Гэта іх бядняцкія палоскі асьцярожна далучалі да сваіх абрэзаных надзелаў кулакі. Гэта іх лічылі «апошнімі людзьмі» Бараны ды Жукі.

«Апошнія людзі» пайшлі ў жорсткую бязьлітасную бойку з «лепшымі» і «сталымі». Выбраны старшынёю Лапіцкага сельскага савету, Савельлеў душыў кулакоў падатковым цяжарам і жалезнымі пальцамі клясавай палітыкі. На аднаго з Бараноў у часе загатовак збожжа накладваюць 60 пудоў збожжа; Баран адмаўляецца даць такую колькасьць; тады Савельлеў склікае тэрміцова пленум сельсавету, дзе на Барана накладваюць 85 пудоў; Баран здае збожжа...

Ідзем у калгас без кулакоў...

Беднякі атрымлівалі ўсе ільготы і прывілеі. Яны гуртаваліся вакол камуністых Мішкі Карпенкі і Савельлева і кожны вечар запаўнялі хату-чытальню, дзе стаяла на тонкай ножцы чорнае дзівоснае кола гучнагаварыцеля...

Усё лета вакол арцелі кіпела барацьба. Быў момант, калі арцельшчыкаў засталося ўсіх 5 чалавек — самых упартых. Але перад новым аказалася, што ў арцелі ўсе маюць збожжа тады, як беднота галадае, і гэта далучыла да арцельшчыкаў яшчэ 20 бядняцкіх гаспадарак. Арцельшчыкі купілі два дамы, атрымалі крэдыты, зьвялі свае палоскі. Суседняя камуна імя Карла Маркса шле на дапамогу «Энгельсу» старога спэца па калгаскіх справах, добрага гаспадара — вусатага Антона Карпенку. Радзееўскія камуністыя разьбіваюцца на дзьве брыгады, ходзяць з хаты ў хату, агітуюць, пераконваюць, спрачаюцца з цёткамі, цягнуць людзей у калгас. Гэта дае яшчэ 50 гаспадарак, сярод іх частку серадняцкіх. Вёска пахіснулася ўжо і паплыла...

У кастрычніку — рэзалюцыя агульнага сходу працоўных сялян вёскі Радзеева: ідзем у калгас **без кулакоў**. Далучаюцца пасёлкі Высокая Грыва і Чыстая Лужа. Бараны падсупляюць беднякоў збожжам, каб яны выступілі на сходзе супроць калектывізаці: «Дурні, вясною вайна будзе, вы ўсе тады заробіце»... Яны навучаюць, як «падпусьціць жука» дакладчыку, як сарваць сход. Ночу, каля хаты Мішкі Карпенкі, затрымліваюць двух чалавек — яны былі накіраваны для забойства лепшага актывістага вёскі. Суд. Яшчэ адзін руйнуючы ўдар па кулаччу. А ў лістападзе да «Энгельса» далучаюцца Лапічы, Чырвонарэчча і пасёлак Завідаўка. Праз некалькі дзён пленум Лапіцкага сельскага савету збявшчае ўсю сваю тэрыторыю — 7.000 гэктараў ворнай зямлі і сенажаці — адным калгасам. А ў сьнежні да «Энгельса» адна за другой далучаюцца вёскі і пасёлкі 8-мі прылеглых да чыгункі сельскіх саветаў Уваравіцкага раёну, цешна каля 10.000 сялянскіх двароў.

На здымках зьлева на права: арганізатары «Энгельса»—т.т. Міхась Карпенка, Самойла Савельлеў, Антон Карпейка. Ніжэй—агра-школа ў калгасе; пішуць заяву аб разбазарваньні кулакамі маемасьці; калгасьнікі атрымоўваюць малако.

Цэнтр гіганта—Радзеева

Рукою масавага руху накідваецца чарнавік гіганцкага калгасу ў 20.000 гэкт. Цэнтр гіганту — Радзеева, тут лепшыя сілы, тут перакрыжоўваюцца шляхі на Жлобін, Буду і Чэчэрск, адсюль усяго поўкілёмэтра да 24-га разьезду Заходняй чыгункі.

Экапамічныя паказальнікі: блізкасьць чыгункі і магілёўскае шашы, дзе-ве рэчкі — утокі Сожу, вялікія залежы торфу, лес з чатырох суседніх лясьніцтваў, палічна цесьляроў і сталяроў у Лапічах, агнятрывальнікаў — у Рудзенцы, калёсьнікаў—у Радзееве, неабсяжныя залежы гліны, 2 цагельні на хаду, добры ўраджай бульбы, лёну і кармовых траў.

Палітычныя паказальнікі: упартае клясавае змаганьне беднаты з кулацтвам, контр-рэвалюцыйная антыкалгасная дзейнасьць царквы і сэктантаў — штундыстых, пабліжэньне серадняка да беднаты і лёзунгаў партыі, аўтарытэт партыйных ячэек і старых камун.

Такая была расстаноўка сіл, калі радзееўцы першыя прыступілі да самага галоўнага — **да абагульненьня жывёлы, насеньня і мёртвага інвэнтару.**

Скрыпела старая вёска

Нытаньне стаяла ўжо не аб рэзалюцыі.

Трэ' было адважыцца адвезьці сваю кароўку ў агульны хлеў, зьвезьці з двара авёс, здаць калёсы, плуг і сена. Гэта была ўжо рэальная ломка тысячагоднягa парадку. Як падламаны дуб, скрыпела і стагнала старая вёска пад рэвалюцыйнай віхурай.

— Я ня проціў... Толькі-б кароўку да вясны... Няхай ідуць, я ня спрэчная, куды людзі — туды я. Толькі-б кароўку...

— Эх, цётка, заблыталася ты ў кароўчым хвосьціку!

— Няхай хвосьцік. Так і памру. Багатаму карабля, а беднаму кастыля.

Другія проста не дазвалялі апісваць маемасьць, зачынялі на замок хаты-падавалі заявы аб выхадзе з калгасу. Сыны ўставалі супроць бацькоў, жонкі супроць мужчын і мужчыны супроць жонак.

У аднэй хаце:

— Калі будзеш ты транжыраваць маю маемасьць — я цябе супакою!..

У другой хаце:

— Раз жонка ня ідзе, дык што-ж мне — разводзіцца?

У трэцяй хаце:

— Хоць рэжце — сваю кароўку не аддам!

Радзееўскі камсамольскі актывісты Рыгор Банузяў адмовіўся абагуліць сваю маемасьць і здаў камсамольскі білет. Зьбіліся з нуці такія свойскія хлопцы, як Зыблеў Пілін і Карпенка Ільля.

Каліж будуць адпраўляць кулацкія „экспарты"

Старыя арцельшчыкі, на чале з камуністымі ня дрэйфілі перад повай закавыкай. Яны ведалі вёску і яе людзей. Адно іх трывожыла: раённыя ўлады цягнулі з рашучымі мерамі супроць кулакоў. Ужо месяц прайшоў, як Уваравіцкі раён быў абвешчаны раёнам суцэльнае калектывізацыі, ужо даўно радзееўцы абвясьцілі сьпіс гаспадарак, падлеглых высяленьню, а ўсё ішло пастарому.

— Калі-ж будуць адпраўляць кулацкія «экспарты»? — настоўліва пытала беднота. — Няма чаго з імі (кулакамі) цацкацца, трэба іх выселіць за межы нашага раёну. Няхай яны дзе-небудзь пашукаюць, як мы шукалі ў мінулыя гады.

Раённыя арганізацыі сапраўды рабілі буйную палітычную памылку. Толькі пасьля першага раённага зьезду калгасьнікаў, дзе патрабаваньне беднаты ліквідаваць кулацтва прагучэла асабліва рэзка, раённыя органы ўзяліся за справу. Але тое, што рашучыя меры супроць кулака ня былі прыняты своечасова, — гэта стварала халадок у батрацка-бядняцкіх масах і прытупляла рэвалюцыйны энтузіязм.

Кулакі рэзалі жывёлу, везьлі ночу ў мястэчка збожжа прадаваць прыватніку. У РВК прыходзілі калгаскія хлопцы з заявамі. Вось адна з іх:

> **„Ва Ўваравіцкі РВК**
> **ЗАЯВА**
>
> **С погляду того, што Кулак вёскі Івольон Міхайлаў Цімок Сергеяв злачынна распрадае сваю маемасьць як-та прадаў кароў свіньняў конай будынкі і все свае збожа. Просит за гэта 2500 руб. і ему ужо заплочана 745 р. и 45 к. за будинки. А пагэтаму просім Уваровіцкі РВК зделат распараднэньня в кароткі срок о ликвидаці маемасти Кулака Міхайлова Тимока.**
>
> **Просицель Т. Вишнян".**

На першым раённым зьезьдзе калгасаў выступае дэлегатка Ефрасіньня Скрабкова і кажа:

— Наколькі Ленін наш уміраў — гаварыў: прыслухвайцеся не адным вухам да народу, а двума... Дык я ня то што, але ня трэба, таварышы, людзей высяляць.

Потым выясьнілася, што гэта Ефрасіньня была падаслана заможнікамі. Ёй, зразумела, на зьезьдзе далі адпор і адабралі мандат. Але цікава ў гэтым факце тое, што заможнікі адважыліся апэляваць да «раённага начальства». Мусіць не такое жорсткае было гэтае «начальства», калі на яго спадзяваліся зрабіць уплыў недабітыя капіталістычныя элемэнты вёскі.

Талака для будучыні

Радзееўцы пайшлі напралом.

І зноў, як тады, калі стваралася арцель, актыў пацягнуў беднату, а за беднатою рушылі серадняцкія сем'і.

Вопісь маемасьці пачалася на другі дзень пасьля пастановы агульнага сходу аб калектывізацыі. Адначасова абвясьцілі сьпіс 30 гаспадароў, якіх будуць высылаць, прычым сюды трапілі і падкулачнікі.

Гэтыя рашучасьць і напорыстасьць мелі надзвычайна важнае значэньне. Бараны, Жукі ды іхнія сьвядомыя і несьвядомыя агенты занепакоіліся, замітусіліся, зьнізілі тон і сталі раптам гарачымі прыхільнікамі калектывізацыі. Пасыпаліся ад іх заявы з просьбамі ў такім духу: «Пашу прыняць мяне ў калгас, как я всегда з групамі, вучасткамі. Такіх вучасткаў праз тыдзень было ўжо каля дзесятка.

Ужо зьяўляліся першыя адзнакі новага парадку:

> **Курить воспрещаться в сороли**

Адусюль нёсься грукат малаткоў і рыканьне жывёлы. Нязвычайная талака — талака для будучыні — кіпела ў Радзееве.

У праўленьні разьмяркоўвалі людзей: каго кароў даглядаць, каго — сьвіней, каго ў канюхі. Спрэчкі, лаянка. Нехта зарэзаў парасё, нехта захаваў авёс, нехта ня здаў карову.

Мішка Карпенка сядзеў за сталом злы і зморана. Куча заяў: «Просьба разрашыць мне прадаць карову для уплаты доўга Узаўскаму Сельхову у суме 25 руб. На астальные грошы хачу купіць надворнага кабана і яшчэ з адзежы в которай я вельмі пуждаюся. Демідаў Якаў». Рэзалюцыя Карпенкі: «Адмовіць. Выдаць 12 руб. у лік маемасьці».

Барацьбу з марным распусканьнем маемасьці вялі жорсткую. Пратаколы. Канфіскацыя. Выключэньне з калгасу. Інакш нельга. Гэта нытаньне жыцьця і сьмерці.

„Мы толькі пачалі"

Усе сапі ў разгоне: хто на станцыю на высеўкі, хто на базу — здаваць сабранае на хатах і дварох жалеза і рызьзё.

Ужо тыдзень, як у Радзееве абагулена ўся жывёла, насеньне і інвэнтар. Засноўваюцца майстэрні: для падладжваньня калёс і саней, для падрыхтоўкі рам для парнікоў і вульлёў. Хлопцы пачыналі капаць леднік для малака. Яго выдавалі цяпер па норме. І многія беднякі ўпяршыню атрымалі магчымасьць даць сваім дзеткам малака.

Малапісьменныя людзі са страшэнным разумовым напружаньнем наладжвалі ўлік рабочых дзён і бухгальтэрыю. Малапісьменныя і нянісьменныя, заклапочаныя і ня кожны дзень сытыя, яны знаходзілі час для аграшколы, для лікбезу, для палітграматы. Трэба.

У дзьве зьмены працавалі трыеры: ужо было ачышчана каля 3.000 пудоў, засталася яшчэ 3.000. З гэтым справа не прагарыць.

Але людзі яшчэ ня ведаюць, дзе, што і колькі трэ' будзе сеяць. Няма канкрэтнага пляну веснавых работ. Раённы аграном Салаўёў сядзеў у «Энгельсе» два дні і напісаў агульны арыентавальны план малочнай фэрмы на 10 год. Гэта добра, але што рабіць заўтра?..

І потым: абагуленьне адбылося палкам толькі ў Радзееве. У іншых вёсках Лапіцкага сельсавету справа толькі распачалася. А як у іншых 7-мі сельскіх саветах? Гавораць таварышы, што і там справа ідзе, але няма поўных вестак, няма сувязі, няма дакладнага ўліку ўсіх плюсаў і мінусаў.

Хмурыць бровы Мішка Карпенка, накручвае вусы Антон, расьсякае кулаком паветра Самойла Савельлеў:

— Сілы нам сюды трэба! Людзей! Мы-ж толькі пачалі...

І ў гэтую гадзіну на ст. Уза тэлеграфісты прымаў тэлеграму з Гомелю:



Вялі кароў у агульны хлеў

«Сельск.-гасп. камуна Энгельс. Уза. 1-га лютага выяжджае пачынчная брыгада Гомсомпрамсаюзу складзе 3-х кавалёў сьлесара шорніка шаўца тчк Гатуйце кузьніцу жалеза паогул працу тчк Брыгада прапрацуе 10 дзён»...

МІХАСЬ ГОЛЬДБЭРГ.

Увага. Гапарар за гэты нарыс аўтарам перадаецца ў фонд калгасу «Энгельс».



Мужчыны ўцяплялі хлявы

БАЙЦЫ БВА ВЫСТУПІЛІ Ў АГРАПАХОД

Чырвонаармейцы дапамогуць сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, і правядзеньню суцэльнай калектывізацыі

Дзесяткі тысяч рабочых рук—на дапамогу правядзеньню веснавой сяўбы ў сацыялістычным сэктары вёскі

Дапаможам правесьці „бальшавіцкую вясну"

Часьці Беларускай вайсковай акругі выйшлі ў аграпаход.

Дзесяткі тысяч людзей, аб'яднаных у брыгады цесьляроў, сталяроў, кавалёў, майстроў па рамонце сельска-гаспадарчых машын, накіраваліся ў вёску, каб выканаць дырэктыву партыі—дапамагчы калектывізацыі батрацка-бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, узмацніць падрыхтоўку да веснавое пасеўнае кампаніі, абярнуўшы яе ў «бальшавіцкую вясну».

Часьці БВА арганізуюць масавы рух батрацтва, беднякоў і сераднякоў за выкананьне генэральнае лініі партыі, на барацьбу за суцэльную калектывізацыю, за ліквідацыю кулацтва.

Чырвоная армія дапаможа паскорыць раскулачваньне ў раёнах суцэльнае калектывізацыі, шляхам узмацненьня ініцыятывы і самадзейнасьці батрацка-бядняцка-серадняцкіх мас.

Умолай работай, дасканалым улікам усяе абстаноўкі ў раёне, чырвонаармейцы дапамогуць згуртаваць масы бедняцка-серадняцкага сялянства і навесьці іх да суцэльнае калектывізацыі раёну, а па базе суцэльнае калектывізацыі—да раскулачваньня, да ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Пабудовай і рамонтам аграмаджаных хлявоў, сельска-гаспадарчых машын, ачысткай насеньня, стварэньнем насенных фондаў, дапамогай у разгортваньні суцэльнае калектывізацыі, арганізацыяй беднаты і батрацтва агітацыяй за генэральную лінію партыі —часьці БВА даб'юцца вялікіх вынікаў у справе сацыялістычнае рэканструкцыі сельскае гаспадаркі.

В.

На аснове шырокага сацыялістычнага спаборніцтва

З 6-га па 10-га лютага Аб'яднаная Беларуская вайсковая школа праводзіць аграпаход.

Арганізуюцца 12 брыгад: сталярная, кавальская, рымарская, па ачыстцы насеньня, прапагандысцкая, арганізацыйная, брыгады па рабоце з беднатою, па рабоце сярод жанчын і г. д.

Увесь склад школы ударным парадкам рыхтуецца да паходу.

Паход пройдзе пад аднакаю сацыялістычнага спаборніцтва курсантаў і камандзіра складу ў найлепшай дапамозе веснавой вясоўнай кампаніі.

Курсанты ўпэўнены, што аграпаход значна падштурхне калектывізацыю Кой даныўшчыны, што ў выніку іх работы на вёсцы будуць дасягнуты значныя поспехі ў галіне сацыялістычнае рэканструкцыі вёскі.

— За суцэльную калектывізацыю, за рашучую ліквідацыю кулацтва, як клясы, за мабілізацыю беднаты вакол пасеўнае кампаніі, за абагуленьне насеньня і жывёлы, за шырокую дапамогу калгасам і бядняцка-серадняцкім масам—пад гэтымі лёзунгамі пройдзе паход АБВШ.

ВАЙТОВІЧ.

2-ая Беларуская—у падшэфных сельсаветах

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

2-га лютага, а 9-й гадзіне раніцы №-скі артполк Беларускае дывізіі выйшаў у аграпаход у два падшэфныя сельсаветы.

Адначасова з задачамі аграпаходу, які паставіў перад сабою полк, праводзілася праверка баявое падрыхтоўкі чырвонаармейцаў і камандзнага складу. Кампалка алдаў загад аб «наступленьні на праціўніка». Батарэі занялі баявыя пазыцыі, хутка была наладжана сувязь; артылерыя начала наступленьне.

Полк, з посьпехам выканаўшы баявое заданьне, разьмясьціўся ў двух сельсаветах—Сеніцкім і Падгайскім. Адразу-ж наладзілі сходы беднаты, лекцыі па розных палітычных пытаньнях.

Першай распачала работу агітбрыгада. На яе долю прыпала задача за два дні абслужыць больш 15 насельніцкіх пунктаў. Прыступілі да работы і 7 брыгад па ачыстцы насеньня, арганізаваныя 3 брыгады кавалёў, дзьве брыгады цесьляроў, дзьве брыгады рымароў і г. д. Пачаўся рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтару беднаты і серадняцтва.

Разгарнула работу два мэдыцынскія і два вэтэрынарныя пункты. Адкрыты сталы даведак, кніжныя кіёскі, находныя чытальні.

2-га лютага вечарам адбыліся кіно-сэансы для вясковага насельніцтва.

Раніцою 3-га лютага чырвонаармейцы пасьпелі вывезьці ў Сеніцкі саўгас 250 вазоў гною.

***

Беднота і серадняцтва сустрэлі з вялікаю радасьцю чырвонаармейскія часьці. Ва ўсіх вёсках чырвонаармейцам быў зроблены самы цёплы, самы радасны прыём. Некалькі дзесяткаў беднякоў і сераднякоў зьвярнуліся да камскладу і чырвонаармейцаў па розныя парады і па дапамогу. Дапамога давалася хутка і неадкладна.

Не абышлося, зразумела, і бяз кулацкай агітацыі. Кулакі распаўсюдзілі правакацыйныя чуткі, што полк прыбыў «заганяць—прымусова сяляні у калгас». Але абыходжаньне чырвонаармейцаў з сялянамі, шырокая дапамога беднаце і серадняком адразу вырвалі глебу з-пад ног кулацтва—чуткам ніхто ня верыў, бо кожны на справе бачыў, з якімі мэтамі праводзіцца аграпаход Чырвонай армії.

У. МЯЖЭВІЧ.

9 ГОД АБВШ

Рыхтуем кадры для РСЧА

Рэканструкцыйны нарыад, які перажывае край, высоўвае задачу аб падрыхтоўцы кадраў. Гэтае нытаньне поўнасьцю адносіцца да нашае школы. Тыя тэмпы работы, якія раней былі добрымі, у сучасных умовах зьяўляюцца ўжо недастатковымі. Матар'яльна-тэхнічная база нашай арміі расьце з агульным ростам нашае гаспадаркі і гэта яшчэ з большаю сілаю высоўвае задачу па падрыхтоўцы кадраў.

ЦК УсеКП(б) у мінулым годзе паставіў перад рабочай клясай задачу **«павялічыць процант пасылкі рабочых, якія маюць вытворны стаж»**,—мы з цяжкасьцю ў Беларусі выканалі гэту задачу, а з цяжкасьцю таму, што нашы грамадзкія арганізацыі адносіліся да гэтае работы з халадком. Камсамол Беларусі яшчэ слаба займаецца нытаньнямі камплектаваньня вайсковых школ, і ў асаблівасьці нашае Беларускае школы.

Школа не адстае і ў агульных задачах па перабудове нашае вёскі, мы зараз паставілі задачу—«Ні адной гаспадаркі курсанта і камандзіра па-за калектывам» і вынікі мы ўжо маем. Прыяжджаючыя з усіх канцоў Беларусі насьля водпуску прывозяць прыемныя весткі, што большая частка гаспадарак курсантаў увайшла ў калгасы.

Побач з нашымі дасягненьнямі мы маем і недахопы, як па навучальнай лініі, так і на палітычнай рабоце. Вось, ня так даўно былі ўскрыты так званыя «камуны», былі ў нас трацкістыя і правыя, на гэтым школа палітычна ўзрасла, але ў далейшым нам трэба работу будаваць больш гібка, каб своячасова рэагаваць на шчыліны ў выхаваньні будучага камандзіра РСЧА.

Уступаючы ў дзесяты год існаваньня школы, мы ставім задачу перад грамадзкімі арганізацыямі, і ў першую чаргу перад камсамолам—даць для кадраў РСЧА лепшую рабочую моладзь, лепшых батракоў і лепшых беднякоў, якія навінны адбірацца загадзя, навінны прайсьці падрыхтоўчыя курсы, даючы ня менш 50 проц. такіх, што маюць асьвету, якая-б раўнялася сямігодны.

Камсамол навінен бліжэй падыйсьці да АБВШ і ён навінен кроўна быць зацікаўленым у больш хуткім росьце кадраў РСЧА як якасна, так і колькасна.

Я. ВАСІЛЕВІЧ.

ДА КІПУЧАЙ НАПРУДЖАНАЙ РАБОТЫ

У дзень гадавіны школы трэба згуртаваць увагу пралетарскай грамадзкасьці на тых вынніках, тых цэнавых бакох і задачах, з якімі школа навінна ўступіць у 10-ты год свайго існаваньня.

АБВШ, як і ўся РСЧА, не зазнала ад тэй кіпучай, напружанай, вялікай работы, якую праводзіць партыя, рабочая кляса ў саюзе з асноўнымі масамі сялянства, па карэннай сацыялістычнай перабудове ўсяе нарэшце гаспадаркі.

Але да рэчы сёньня будзе ўспомніць і тыя палітычныя недахопы, якія мелі месца ў бягучым годзе ў жыцьці школы і работы партарганізацыі.

Партарганізацыя школы трымала тры экзамэны—на справе Кульміцкага, Быкава і «арганізаваных камун», якія вядомы былі пралетарскай грамадзкасьці і часьцям Чырвонай арміі. Гэтыя экзамэны, у барацьбе з правым ухілам, эпэтэмі контр-рэвалюцыйнага трацкізму і за выкарыстаньне актыўнасьці курсантаў, ня былі поўнасьцю вытрыманы. Партарганізацыя школы мела ад гэтых буйных памылак вялікія палітычныя ўрокі, якія ўлічаны і трэба спадзявацца, што яны больш не паўторацца. Партарганізацыя разгарнула зараз вялікую работу па аздараўленьні раду зьвяньняў у школе і па рашучай барацьбе з рэдкамі дробных недахопаў.

Вялікім недахопам у рабоце школы трэба прызнаць і тое, што тэмпы работы партарганізацыі, якасьць выкананьня навучальнага пляну яшчэ далёка не адпавядаюць тым тэмпам, якімі жыве партыя, рабочая кляса і РСЧА.

Уступаючы ў 10-ты год існаваньня, перад партарганізацыяй і школай удалку стаяць вялізныя задачы.

Трэба дабіцца 100 проц. ахопу сацспаборніцтвам усяго складу школы і падняцьця сацспаборніцтва на вышэйшую ступень з установкай, каб школа на тэмпе, на якасьці і ўсіх зьмесьце работы—стала ўдарнай.

З усёй вострасьцю разгарнуць самакрытыку, забясьпечыўшы ёю посьпяховае і якаснае выкананьне навучальна-палітычных плянаў, рашучую барацьбу супроць усіх ухілаў і адхіленьняў ад ленінскай лініі партыі і, у першую чаргу, з галоўнай небясьпекай—правым ухілам і нацыянал-дэмакратызмам.

Трэба ўцягнуць у актыўную палітычную работу на сацыялістычным будаўніцтве кожнага камандзіра, палітработніка і курсанта па лініі рашучага наступленьня і выкарчоўваньня капіталістычных элемэнтаў, разьвіцця калектывізацыі і ліквідацыі кулака, як клясы.

Партарганізацыі, у адпаведнасьці з гэтымі задачамі, неабходна правесьці вялікія мерапрыемствы па перабудове мэтадаў работы, палепшэньні якасьці і форм партыйнага кіраўніцтва.

КОНЮХАЎ.

Менская акруговая канфэрэнцыя калгасьнікаў

Меншчына--перад веснавой сяўбой

На вячэрнім пасяджэньні 2-га лютага быў заслуханы даклад тав. **Каранеўскага** аб веснавой пасеўнай кампаніі.

У пачатку свайго дакладу т. Каранеўскі спыніўся на значэньні бягучай пасеўнай кампаніі. У гэтым годзе падрыхтоўка да веснавое сяўбы набывае выключна важнае значэньне, бо ад яе посьпеху залежыць посьпех сацыялістычнае рэканструкцыі сельскае гаспадаркі.

Зараз перад нізавымі савецкімі органамі, перад вясковай грамадзкасьцю, перад бяднацка-серадняцкімі масамі стаіць задача—на аснове правядзеньня суцэльнай калектывізацыі ажыцьцявіць палітыку партыі адносна ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Трэба паскорыць тэмп калектывізацыі, **давесьці сельска-гаспадарчую плошчу пад калгасамі да веснавой сяўбы ня менш, як да 40 проц., а да канца году—да 60 проц. усёй плошчы акругі;** пашырыць пасеўную плошчу ў калгасах ня менш, чым на 6 проц.; падняць ураджайнасьць у калгасах на 28 проц. супроць сярэдняга ўраджаю 1924—28 г. г.; закончыць арганізацыю ўласных насенных фондаў у калгасах, не пазьней 10 лютага; праз сыстэму сельска-гаспадарчай каапэрацыі ўзмацніць загатоўку насеньня ў акрузе, у тым ліку і агароднага; максымальна скарыстаць насеньне, забранае ад кулакоў у раёнах суцэльнай калектывізацыі.

Калгасы павінны да 20 лютага закончыць работу па ачыстцы і пратручваньні насеньня

— **На мясцох яшчэ зусім марудна ідзе абагульненьне насеньня, сродкаў вытворчасьці, інвэнтару і г. д.** Тэмп абагульненьня павінен быць узмацнены.

— У гэтым годзе ў акрузе арганізуецца 50 майстэрань па рамонце сельска-гаспадарчых машын і інвэнтару. Для майстэрань у максымальнай меры трэба скарыстаць жалезны лом і старыя запасы жалеза. Машына-трактарныя станцыі вызначана арганізаваць у Фаніпалі, Дукоры, Косіна, Старыца і г. д. У кожным калгасе павінна быць абсталявана кузьня.

— **Выключна важнае значэньне набывае справа жывёлагадоўлі.** Да апошняга часу нагляджаюцца выпадкі распродажу жывёлы калгасьнікамі і кулацтвам. Месячнік, які абвешчаны, павінен дапамагчы захаваньню ня толькі буйной, але і дробнай жывёлы. Зараз вызначана арганізаваць 26 буйных малочных гасадарак у ваколіцах Менску і Барысава з лікам 12 тысяч кароў.

Нарэшце, тав. Каранеўскі спыніўся на ролі саўгасаў у пасеўнай кампаніі.

***

Ад імя ЦВК БССР вітаў першую акруговую канфэрэнцыю калгасьнікаў старшыня ЦВК тав. **Чарвякоў.** Тав. Чарвякоў ахарактарызаваў значэньне новага этапу, пералому ў палітыцы партыі на вёсцы.

Спрэчкі

Для ўдзелу ў спрэчках запісаліся 22 чалавекі. Выказаліся калі 15.

Дэлегаты, што выступалі ў спрэчках, зазначалі на марудносьць абагульненьня насеньня, інвэнтару і жывёлы.

Барацьба з распродажам маемасьці вядзецца недыстарчальна.

— Індывідуальнае абкладаньне ў Вузьдзенскім раёне,—зазначае тав. **Пармонаў,**—закранула серадняцкія гасподаркі. Памылкі ў абкладаньні трэба неадкладна выправіць. У калгасы пралезьлі шкодныя элемэнты, якія зрываюць работу па абагульненьні жывёлы і інвэнтару калгасьнікаў. Насеньне ў калгасах ёсьць, між тым, пад уплывам кулацтва некаторыя калгасы закідалі селькрэдыт заяўкамі на насеньне. Чыстка павінна пазбавіць калгасы ад шкоднікаў.

— Пляны акрэдытаваньня ня прыстасаваны да ўмоў асобных калгасаў; калгасьнікам цяжка разабрацца ў такіх складаных пляках. Трэба іх спрасьціць.

Тав. **Лявіцкі** зварачае ўвагу на тое, каб прамысловасьць пачала выпускаць не аднаконныя плугі і малыя сячкарні, а выробляць машыны для буйной гаспадаркі. Дрэнна і тое, што да гэтага часу няма праектаў буйных цеплавых будынкаў, каб ня траціць дарэмна сродкаў на непатрэбнае будаўніцтва.

— Апрача абагульненьня жывёлы і насеньня,—кажа т. **Хадасэвіч,** з Барысаўшчыны,—трэба ўжыць меры да абагульненьня лесаматар'ялу, бо ў некаторых гаспадароў яго ёсьць шмат. Гэты матар'ял зараз распрадаецца, паліцца і г. д.

Арганізацыя працы у калгасах

Канфэрэнцыя заслухала даклад тав. **Цынкова** аб арганізацыі калектыўнай гаспадаркі, працы і аплаты.

— Пытаньне арганізацыі гаспадаркі і аплаты працы вельмі складанае,—кажа дакладчык. Ён паказвае, як у калгасе павінна быць пастаўлена арганізацыйная работа, культурна-асьветная і г. д.

— Многімі калгасамі складзены нижыцьцёвыя, няправільныя пляны разьмеркаваньня рабочае сілы. Некаторыя склалі такія пляны, што або не хапае рабочае сілы, або яе лішкі. Гэта бязумоўна няправільна. Лішняй рабочай сілы ў калгасе не павінна быць, трэба правільна разьмеркаваць рабочую сілу.

Дакладчык асабліва спыніўся на мэтадах работы ў калгасах і на яе аплаце. Рабочую сілу трэба разьбіць па яе кваліфікацыі па брыгадах. Кожная брыгада павінна выконваць пэўную работу, як засеў аўсу, жыта і г. д.

Форма аплаты на едакох і сем'ях, як гэта практыкуецца ў некаторых калгасах, ня жыцьцёвая і не дае пэўнага эфэкту. Трэба ўвесьці нормы выпрацоўкі. Пры ўвядзеньні норм выпрацоўкі навялічыцца прадукцыйнасьць працы. Бязумоўна, ня трэба забывацца і на якасьць працы.

Рад таварышоў, якія выступалі ў спрэчках, асабліва зьвярнулі ўвагу на ўвядзеньне ў калгасах норм выпрацоўкі.

Большасьць прамоўцаў прызналі, што ўвядзеньне норм павінна даць вялікі вытворчы эфэкт.

Выклік Мазыршчыны прыняты

На вячэрнім пасяджэньні 3-га лютага канфэрэнцыя заслухала інфармацыю тав. **Тамашэўскага** аб сацыялістычным дагаворы паміж Менскай і Мазырскай акругамі.

Мазырская акруга выклікала Менскую на спаборніцтва па калектывізацыі. Мазырская акруга калектывізуе да веснавое сяўбы 4 раёны на 100 проц., рэшту раёнаў—на 60 проц., што будзе да веснавое сяўбы складаць 70-75 проц. пасеўнае плошчы акругі.

Менская акруга зараз калектывізавана на 35 проц. Амаль цалкам калектывізаваны Капыльскі і Сьмілаўскі раёны. Да веснавое пасеўнае кампаніі трэба ахапіць калгасамі 40 проц. агульнае плошчы.

За 1931 год трэба цалкам калектывізаваць Менскую акругу.

Канфэрэнцыя калгасьнікаў прыняла выклік Мазырскай акругі і ўзяла на слоб абавязак—наладзіць арганізацыю працы ў калгасах, скарыстаньне машын, выканаць аграмінімум, павысіць ураджайнасьць, разам з гэтым шырока разгарнуць сацыяналістычнае паміж асобнымі калгасамі.

Канфэрэнцыя даручыла акрэдытаваньню надпісаць сацыялістычны дагавор з Мазырскай акругай.

МЕНСК

Перапіс рабочых БССР

Статыстычныя органы прыступілі да правядзеньня суцэльнага перапісу рабочых, заняты у буйной цэнзавай прамысловасьці і чыгуначных майстэрнях. Вынікі перапісу будуць пакладзены ў аснову пляну падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі рабочых кадраў, у адпаведнасьці з задачамі, высунутымі 5-цігадовым плянам рэканструкцыі народнае гаспадаркі БССР.

ЦКПСБ зьвярнуўся з прапановаю да ўсіх ФЗМК, грамадзкіх арганізацый і ўсіх рабочых—актыўна дапамагаць пра вядзеньню перапісу на прадпрыемствах.

Мабілізацыя 95 спэцыялістых на вытворчасьць

БелМБІТ пастанавіў перакінуць 95 спэцыялістых на вытворчасьць. Па сэкцыі сельска-гаспадарчых спэцыялістых будзе мабілізавана 57 чалавек, сэкцыі будаўнікоў—8, саюзу савецкіх і гандлёвых служачых—10, мэталістых—4 і г. д. Створаецца камісія па разьвярстаньні мабілізаваных спэцыялістых.

Назначэньні

Намесьнікам старшыні Менскага акрвыканкому і старшынёю плянавае камісіі абраны т. **Матусэвіч**, які раней працаваў у Менсельпраме.

***

Дырэктарам Аўтакіраўніцтва назначаны рабочы-чыгуначнік—токар па мэталі т. **Дашчатаў.**

У прэзыдыуме Менгарсавету

— Прэзыдыум Менгарсавету разгледзеў пытаньне аб скандэньні каналізацыі ў Менску. Прапанагана Вадаканалу ўсе работы па каналізацыі скончыць не пазьней 10-га лютага, калі адбудзецца спробны пуск каналізацыі.

— Прэзыдыум гарсавету пастанавіў пабудаваць у бягучым годзе 76-кватэрны дом на Маскоўскай вул. і 12-кватэрны дом па Пярэсьне.

Усебеларускія канфэрэнцыі рабочых-фізкультурнікаў

8-га лютага адкрываюцца ўсебеларускія канфэрэнцыі фізкультурнікаў саюзаў гарбароў і швэйнікаў.

12-га лютага адкрыюцца канфэрэнцыі фізкультурнікаў саюзу саўгандальслужачых, працмастацтва і мэдсанпрацы. На канфэрэнцыях будуць абгавораны пытаньні аб стане фізкультурнай работы і аб пераходзе на новыя формы работы ў сувязі з пастановамі ЦК УсеКП(б) і УсеЦСПС.

Новая школа на Серабранцы

Вясной на Серабранцы пачнецца пабудова новай сямігодкі. На будаўніцтва адпушчана 40.000 руб. Школа будзе гатова ў 1931 годзе.

Усебеларуская нарада таварыства „Прэч няпісьменнасьць"

Сёньня ў Менску адкрываецца ўсебеларуская нарада таварыства «Прэч няпісьменнасьць». У нарадку дня: удзел таварыства «Прэч няпісьменнасьць» у пасеўнай кампаніі, аб перабудове пляну ліквідацыі няпісьменнасьці і г. д.

****

Вячэрні рабфак. Пачатак заняткаў пасьля зімовых канікул 7-га лютага, а 6-й гадзіне.

Прымаюцца заявы ад жадаючых паступіць на 1-шы і 2-гі курсы **яўрэйскага** аддзяленьня (пры наяўнасьці адпаведнай падрыхтоўкі).

На агульнае аддзяленьне прыёму няма.

Сацыяльна-чужы элемэнт выключаны з БДУ

Праўленьне БДУ выключыла з ліку студэнтаў дачку былых памешчыкаў Камарову А. Я., якая вучылася на 4-м курсе пэдфаку. Бацькі яе мелі 400 дзес. зямлі. Камарова пры паступленьні ў БДУ ўтаіла сваё сапраўднае сацыяльнае становішча.

Выключаны таксама з БДУ за ўтойваньне сацыяльнага становішча дзеці кулакоў: Чумак А. Н. (праўгас), Матусэвіч А. П. (пэдфак), Караткевіч Я. Л. (праўгас)), Руткоўская З. П. (пэдфак) і Федарычык А. С.; дзеці былых жандараў: Міхайлава Г. А., Беляеў М. Я. і Сьцяжковіч Т. Ф. (пэдфак). За сувязь з чужым і контр-рэвалюцыйным элемэнтам выключана студэнтка 3-га курсу сацыяльна-гістарычнага аддзяленьня пэдфаку Мястоўская Я. А.

З лістоў рабселькораў

Гарнітуры дрэннай якасьці

Нядаўна мы пісалі аб тым, што загадчык складу МЦРК тав. **Трэйбіч** прыняў партыю скураных куртак дрэннае якасьці. Гэтымі днямі тав. Трэйбіч прыняў партыю гарнітураў — вырабу Барысаўскага працкалектыву швэйнікаў. Аб якасьці гэтых гарнітураў можна меркаваць на тым, што адна пара штаноў пашыта з рознага матар'ялу: адна штаніна суконная (№ 1900), другая—паўсуконная (№ 1700), колеры розныя, па разьмеры ні на каго не падыходзіць, шыцьцё кепскае.

Такая работа нікуды ня варта.

НАБАТ.

Рабочыя мерзнуць

Ад станцыі «Старушка» (Мазыршчына) да лесапільнага заводу «Праца» праведзена, на адлегласьці 32 кілёмэтраў, вузкакалейка. Крытых ваганэтак яна зусім ня мае. Рабочым прыходзіцца езьдзіць у самае дрэннае надвор'е на паравозе і мерзнуць пад адкрытым небам. Трэба пабудаваць крытую ваганэтку.

Н.

У запале спаборніцтва

Сярод супрацоўнікаў галоўнае канторы гомельскага заводу імя Ланцуцкага зусім не праводзіцца сацыялістычнае спаборніцтва. 8мі-гадзінны рабочы дзень работай цалкам не запаўняецца. Супрацоўнік канторы Лапін у службовы час замест работы займаецца складаньнем любоўных вершаў супрацоўнікам. Адміністрацыя на ўсё гэта не зварачае ўвагі і ня сочыць за тым, ці маюць выстарчальную нагрузку супрацоўнікі канторы.

П. К.

Шкодніцтва ў Копыльскай хлебапякарні

Праўленьне Копыльскага спажывецкага таварыства зьняло з работы ў хлебапякарні хлебапёка Кунцэвіча Е., які займаўся шкодніцтвам у каапэрацыі і выпускаў у продаж нядобраякасны хлеб. Спэцыяльная камісія пры абсьледваньні пякарні выявіла там больш за 400 клг. папсаванага хлеба. Вінаватыя аддаюцца пад суд.

Хто іх падцягне?

Старшыня праўленьня ЖАКТу № 5 вельмі нядбайна адносіцца да ліквідацыі няпісьменнасьці. У ЖАКТе № 1 наглядаецца тое-ж самае. У ЖАКТе № 16 справа з ліквідацыяй няпісьменнасьці таксама не на вышыні.

Хто іх падцягне?

К—ч. І Н.

Пад'ёмныя для мабілізаваных на работу ў калгасы

Паводле пастановы Наркампрацы БССР, прадпрыемствы і ўстановы, у якіх працуюць асобы, мабілізаваныя на сталую працу ў калгасы, павінны выплачваць гэтым асобам пад'ёмныя з разьліку месячнага акладу пэнсіі і ¼ акладу на кожнага члена сям'і., які пераяжджае разам з мабілізаваным таварышом, сутачныя з разьліку 1/30 месячнага акладу за 6 дзён і кошт правозу багажу (240 клгр. на даную асобу і па 80 клгр. на кожнага члена сям'і.

Вечар-сустрэча камсамольцаў з белапаўцамі

2-га лютага ячэйка ЛКСМ і дзяржаўнай друкарні і Белдзяржвыдавецтва наладзілі вечар-сустрэчу з беларускімі і яўрэйскімі пісьменнікамі ў сувязі з трох месячнікам беларускай і нацменаўскай літаратуры.

Пісьменнікі Фамін, Звонак, Маракоў і інш. прачыталі некаторыя з сваіх вершаў, пасьля чаго камсамольцы выступілі з крытыкай і паказвалі на ідэалёгічныя і тэхнічныя памылкі гэтых вершаў.

Вялікі пажар у м. Вузьдзе

Згарэў народны дом

Нядаўна ў м. Вузьдзе здарыўся пажар. Згарэў народны дом з усім абсталяваньнем: бібліятэка, дэкарацыя, кінапарат, кіно-істужка і інш. Страты ад пажару каля 20.000 руб. Чалавечых ахвяр няма. Пажар узьнік ад кіно-стацыянарыі, якая была пастаўлена ў адным пакоі народнага дому, без захаваньня самых элемэнтарных пажарных правіл. Пажарныя арганізацыі ад кіно-стацыянарцы ня ведалі, на яе ўстаноўку дазволу не давалі.

Нядбайныя адносіны да пажарнае справы каштавалі 20.000 руб.

Прэзыдыум акрвыканкому пастанавіў перадаць справу ў пракуратуру, для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.

Новы вопыт у клюбнай рабоце

У панядзелак, 10-га лютага ў цэнтральным яўрэйскім клюбе імя Леніна рабочым драматычным гуртком клюбу будзе паказана п'еса «Мэксыканец» на яўрэйскай мове. Кіруе пастаноўкай рэжысэр Дзярж. яўр. тэатру т. Айзэнберг. П'еса будзе суправаджацца першым рабочым сымфанічным аркестрам клюбу пад кіраўніцтвам студэнта музтэхнікуму т. В. Белкіна. П'еса характарызуе рэвалюцыйнае змаганьне рабочых і сялян Мэксыкі супроць панаваньня амэрыканскага капіталізму. Характэрна адначыць, што адначасовае выкарыстаньне адной пастаноўкай некалькіх рабочых гурткоў клюбу зьяўляецца ў клюбнай рабоце ўпершыню.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ

— **Менскае мэдычнае таварыства.** А 9-й гадз. веч., у клюбе «Мэдпрацаўнік», адбудзецца 27-е пасяджэньне. На парадку дня—дэманстраваньне хворых, «аб алавяным атручваньні рабочых-гончароў» (д-ры Флекель і Чарноў) і тэрапэўтычны ўплыў эсэнтускіх мінеральных вод» (д-ры Васёўскі і Ліпец).

ЗАЎТРА

— **Дом Камасьветы.** У пакоі № 19 кансультацыя нам. старш. цэнтр. савету бязбожнікаў СССР т. Лукачэўскага для антырэлігійных працаўнікоў і членаў бюро яч. бязбожнікаў на тэму: «Задачы антырэлігійнае працы». Пач. а 8½ гадз. увеч. Яўка антырэлігійнага актыву абавязкова.

— **У чацьвер,** 6 лютага, а 3 гадз. дня, у памяшк. фабрыкі «Адраджэньне» (Вяземская, 5), пачынаецца чыстка яч. КП(б)В ф-кі «Адраджэньне».

— **Клюб Працасьветы.** 7 лютага а 7 гадз. веч. склік. 2-я група раён. дэлег. сходу Фрунз. р.

— 7 лютага, а 6 гадз. веч. у Доме Камасьветы адбудзецца даклад тав. Лукачэўскага (нам. старшыні цэнтр. Савету валўнічых бязбожнікаў СССР) для пізавога партыйнага, камсамольскага і прафсыйнага актыву на тэму: «Чарговыя задачы партыі ў галіне антырэлігійнае працы».

Пасьля дакладу мастацкая частка.

Білеты, разасланыя на ячэйках на 7 лютага на літаратурна-мастацкі вечар, маюць моц і на даклад тав. Лукачэўскага.

Ячэйкі, якія не атрымалі білетаў, зварочваюцца ў чытальню дому.

Парткінонарада

6-га лютага 1930 г., а 11-й гадз. раніцы пры аддзеле Культуры і Прапаганды ЦК КП(б)Б адбудзецца нарада на пытаньні **кіно.**

Парадак дня наступны:

1. Тэматычны плян БДК на 1930 г. і выкананьне вытворчага пляну за 1929 год т.т. **Александровіч і Кацнэльсон.**
2. Аб сцэнарыях і сцэнарыстых — т.т. **Кацнельсон і Матусаў.**
3. Аб кадрах — т. **Галкін.**

На нараду запрашаюцца таварышы: Платун, Некрашэвіч, Гурскі, Галкін, Матусаў, Кацнэльсон, Александровіч, Будзінскі, Копакоцін, Ульянаў, Міцькоў, Лабадаеў, Бурава, Галавач, Мурашка, Вечар, Чарот, Шоламаў, Клімковіч, Папова, Паніматко, Сьмірноў (калгасцэнтр), Цэпцыпэр, Радкевіч, Пятушкоў, Міхайлаў, Лук'янчык, Стракоўскі, Рычкоў, Гінзбург, Туркеніч (Белкаапсаюз), Муханура, Масэвіч, Глебка, Ашаровіч, Вансоўскі, Бучукас, Думс, Раманчук, Біргер.

ПАПРАЎКІ

Ва ўчарашнім нумары газ. «Зьвязда» на апошняй старонцы ўкраліся наступныя памылкі: у артыкуле «МЦРК зварачае мала ўвагі на рабочыя акраіны» надрукавана «... у мэтах баранцьбы з продажам дэфіцытнага тавару», а трэба «дэфэктнага тавару».

У заметцы «15.000 новых ударнікаў» замест 300.000 чалавек, трэба чытаць 30.000 чал.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

Шэфработу--на новыя рэйкі

Хэмікі Менску—шэфы над Чэрвенскім раёнам

2 лютага адбыўся агульна-гарадзкі сход рабочых-хэмікаў Менску, на якім прысутнічала каля 600 чалавек.

Сход пастанавіў **узяць шэфства над Чэрвенскім раёнам.** Перад рабочымі-хэмікамі г. Менску—вялікая і адказная задача—дапамагчы працоўнаму сялянству Чэрвенскага раёну ў справе калектывізацыі, абагуленьня сродкаў вытворчасьці і г. д.

Чэрвенскі раён у калектывізацыі значна адстае, калгасамі занята ўсяго 20 проц. агульнай пасеўнай плошчы раёну.

Рабочыя хэмікі рашуча заявілі, што **яны пакладуць усе намаганьні, каб дапамагчы падшэфнаму раёну правесьці суцэльную калектывізацыю.**

Рад таварышоў, якія выступалі ў спрэчках, заяўлялі аб поўнай гатоўнасьці адпрацаваць на аднаму дню на працягу трох месяцаў, аб адлічэньні процанту ў дапамогу падшэфнага раёну. Адзін з рабочых даў абяцаньне, што ён на працягу трох месяцаў будзе прадаваць у фонд калектывізацыі штомесячна па 2 дні.

Горача адгукнуліся на заклік дапамагчы падшэфнаму раёну жанчыны-работніцы. Яны адна за аднэй тут-жа перадавалі ў фонд шэфтаварыства па 2-3 рублі, выклікаючы жонак рабочых.

Агульны сход аднагалосна пастанавіў адлічыць 1 проц. зарплаты ў працягу трох месяцаў на карысьць падшэфнага раёну.

Пры ЦП саюзе хэмікаў арганізавана шэфбюро з пяці чалавек, якое будзе кіраваць усёй шэфскай работай над Чэрвенскім раёнам.

Б—к.

Шкодніцтва на пабудовах

З-за шматлікіх перароблак тысячы руб. выкінуты на вецер

Яшчэ два гады назад Белкаапсаюз пачаў будаваць камяніцы для складаў сваёй базы.

Тэхнік **Газэльскі** склаў плян і кашторыс і прыступіў да работы. Быў закладзены фундамант, пачалася кладка сьцен, выявілася, што няма ванны, прышлося перакласьці сьцены з цэмэнту, на што пашло 5 вагонаў цэмэнту. Гэта **першая памылка.**

Калі ўжо сьцены будынку былі ўзьняты на паўтары мэтры вышыні, тэхнік адумаўся, убачыў, што фундамант ня вытрымае будынку—прышлося зноў рассакаць, зламаць фундамант, пракладваць рэйкі і г. д. Нямала грошай выкінута і на гэта. Гэта **другая памылка.**

Вось і **трэцяя.** Бэтоншчыку Раманаву было даручана шукаць жалеза для арматуры. Ён набыў жалеза ў прыватных асоб, прычым тавар аказаўся нягодным. Жалеза і зараз валяецца ва дварэ. Калі ўжо былі пастаўлены ваконныя рамы, прараб Гуськевіч атрымаў ад тэхніка Газэльскага загад выламаць рамы і звузіць іх. Калі-б рабочыя не запратэставалі, прышлося-б затраціць вялікую суму на ломку сьцен і рам.

Вось кароткая гісторыя двухгадовага будаўніцтва каменных складаў Белкаапсаюзу. На гэтым злоўжываньні яшчэ ня скончыліся.

Пачалося будаўніцтва драўлянага хлява. Усё было зроблена, акрамя страхі, але не прадугледзелі пажарных правіл, прышлося хлеў зьнесьці і пачаць пабудову на іншым месцы. Пры разборцы і пераносцы матар'ялу шмат яго папсавалася.

Раптам выявілася, што хлеў на новым месцы чамусьці перашкаджае жалезна-скабянаму складу; паводле настаяньня загадчыка складам, хлеў быў зноў зьнесены і пастаўлены на трэцім месцы. Мала таго, зараз аказалася, што аб'ём хлява **не** адавальне запатрабаваньняў, прышлося разабраць яго амаль у чацьверты раз і пабудаваць новы ў большым разьмеры.

Сьледчыя органы павінны зацікавіцца гэтай абураючай безгаспадарчасьцю і выявіць шкодніка, якія марна трацяць дзяржаўныя сродкі.

ВОКА.

„Прэч адсюль!"

— такім прывітаньнем сустрэў старшыня мясцкому белканторы Саюзхлеба **Дэмбін** камісію ЦП саюзу саўгандальслужачых, якая прышла абсьледваць работу апарату і мясцкому Саюзхлеба.

Учынак Дэмбіна, нарэшце, вывеў з цярпеньня ЦП саюзу, і прэзыдыум ЦП пастанавіў вывесьці Дэмбіна са складу мясцкому за яго «неэтычны» ўчынак.

Старшыня мясцкому Дэмбін—такая нікчэмная персона, што аб ім ця варта было-б пісаць, але справа тут ня ў Дэмбіну, які выгнаў камісію, а ў тым, што вось ужо 2-3 месяцы, як Дэмбін камандуе ў мясцкоме Саюзхлеба, Дэмбін голасна робіць паклёны на рабкорэў, са мым агідным чынам зацісканае самакрытыку і **на ўсе гэтыя агіднасьці да гэтага часу ніхто не рэагаваў.**

ЦП саюзу даўно павінна было даць Дэмбіну на руках, а не чакаць, пакуль ён адважыцца выгнаць камісію саюзу. Вельмі доўга цэрэмоніліся з Дэмбіным!

ВОКА.

Водгукі на заметкі

Гейштарава не апраўдала давер'я

Рабочы-беларус у Гомелі купіў дом і самаўласна хацеў высяліць кватаранта яўрэя. Перад домам сабраўся натоўп, сярод якога антысэміты павялі ўзмоцненую агітацыю, у якой прымала ўдзел жонка камуністага—кандыдат у члены гарсавету Гейштарава. Аб гэтым пісалася ў № 240 газ. «Зьвязда».

Агульны сход рабочых лесапільні «Сацыялізм», абгаварыўшы гэтае пытаньне, пастанавіў Гейштараву за антысэміцкія і контр-рэвалюцыйныя выступленьні ад клікаць з гарсавету. Прэзыдыум гомельскага гарсавету згадзіўся з пастановай агульнага сходу і выключыў яе са складу кандыдатаў у члены гарсавету.

Водпуск прадуктаў—наладжаны

У артыкуле «Ідзеце ў Лесбел і атрымайце прадукты», які быў зьмешчаны ў № 295 газ. «Зьвязда», пісалася аб несвачасовай забясьпечанасьці рабочых лесарубаў Бабруйшчыны прадуктамі харчаваньня. Бабруйскі акрсаюз спажывецкага таварыства паведамляе, што зараз пытаньне з забясьпячэньнем рабочых лесарубаў прадуктамі харчаваньня ўладжана. У Клічаўскім спажывецкім т-ве ўстаноўлены адпаведны дзень і час на выдачу прадуктаў, а ў Сьвісланцкім, у вёсцы Люціна, адкрыты спэцыяльны ларок. Паказаньня факты аб махорцы не адпавядаюць сапраўднасьці.

За зрыў падпіскі на газэты —да адказнасьці

Рэдакцыя атрымала некалькі заяў ад рабочых гуты імя Домбаля і ад вайсковай часьці г. Нова-Барысава, што газэты атрымліваюцца не сваячасова, а некаторыя падпісчыкі зусім іх не атрымліваюць. Акрамя таго, работнікі Нова-Барысаўскай пошты нядобрасумленна адносяцца да падпіскі, кажучы: «на чорта вы столькі назьбіралі падпіскі, нам няма часу з ёю вазіцца». Ня зданы заказ вайсковае часьці. На запытаньне—чаму? Адказваюць: «яшчэ пасьпеем». У выніку гэтага вайсковцы доўгі час не атрымлівалі газэт.

Менская паштовая кантора паведаміла, што ўсе гэтыя недарэчнасьці мелі месца па віне супрацоўніка Барысаўскай пошты Плескачэўскага. Апошні прыцягваецца да адказнасьці за зрыў падпіскі.

Дагавор анулёваны

У 1927 г. Астрашыцка-Гарадзецкі РВК узяў ад спажывецкага т-ва ў арэнду кіно. Дагавор заключаны быў на пяцігодны тэрмін, паводле якога РВК павінен быў плаціць кожны месяц 50 проц. чыстага збору. Аўтар заметкі «Плачуць грамадзкія грошы» скардзіўся, што спажывецкае таварыства ня можа атрымаць ад РВК грошы. Расьсьледваньнем выяўлена, што дагавор быў заключаны на кабальных умовах для РВК. Зараз дагавор анулёваны. Спажывецкаму т-ву прапанавана **ўзяць кіно ў сваю** эксплёатацыю і рэгулярна даваць кіно-сэансы ў нардоме.

Рэгістрацыя спэцыялістых народнае гаспадаркі

Наркампрацы БССР праводзіць да 25 лютага рэгістрацыю ўсіх спэцыялістых як са скончанай, так і не скончанай вышэйшай і сярэдняй асьветай, а таксама асоб без адпаведнай асьветы, але якія працуюць, як спэцыялістыя-практыкі.

Рэгістрацыя праводзіцца акруговымі інспэкцыямі працы, прычым тыя спэцыялістыя, якія жывуць у акруговых гарадох, павінны зьявіцца асабіста для рэгістрацыі ў акруговую інспэкцыю працы. Рэгістрацыйныя карткі на ўсіх іншых спэцыялістых запаўняюцца адпаведнымі прапрыемствамі і ўстановамі.

Рэгістрацыя спэцыялістых, што працуюць у прамысловых прадпрыемствах, павінна быць скончана не пазьней 7-га лютага.

Спэцыялістыя, якія ўхіляюцца ад рэгістрацыі, падлягаюць крымінальнай адказнасьці

Ад рэгістрацыі вызваляюцца спэцыялістыя, што знаходзяцца на вайсковай службе ў часьцях і ўстановах Чырвонай армії і ў рэзэрве начскладу РСЧА.

Не падлягаюць таксама рэгістрацыі тыя спэцыялістыя, якія страцілі 50 процантаў працаздольнасьці, і спэцыялістыя чужаземных дзяржаў, што пражываюць на тэрыторыі БССР.

Да ведама інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў Менску

Сёньня, 5-га лютага г.г., а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні Дому Камсамолу (Камсамольская, 25) рэдакцыяй газэты «Чырвоная Зьмена» разам з МБІТ склікаецца нарада інжынэраў і тэхнікаў г. Менску па пытаньні ўдзелу ў тэхнічнай кансультацыі пры газэце «Чырвоная Зьмена».

На нараду запрашаюцца т.т. Сульскі, Радаў (Мэталятрэст), Шлапакоў і Вэгэр (завод «Энэргія»), Зуэрман («Камунар»), Курман, Шэўчанка, Савіцкі, Розэнфэльд, Шляпачнікаў, Маскалеўскі, Рыўкін, Нісьневіч, Айзэнбэрг, Нікеліс, Арляцоў, Эпштэйн, Івашоў, Розін (ВСНГБ), Рэцкі, Галавінскі, Рабілаў (інстытут прамысловасьці), Сульскі М. Н., Бромбэрг, Макрыцкі (Лесбел), Ёнтаф (скуртрэст), Цыпэровіч (шклотрэст), Шэр (завод «Бальшавік»), Млоцін (папертрэст), Гузман, Гардон (Белжылсаюз), Яноўскі, Адэльскі, Чаркоў (Белдзяржбуд), Сухавораў (колгасцэнтр), Каржанеўскі, Маскоў, Каманскі (Дзяржплян). Добкін, Марголін (Эльвод), Шапіро, Эпштэйн (Белбудтрэст), Валсецкі, Ляховіч, Міхаленка, Шмэрлін, Рашотнікаў (Наркамзем), Позьняк (зав. «Чырвоная Зорка»), Маўшовіч, Абрамовіч (Харчтрэст), Любошыц (Белсаўтастрэст), Кіпрыянец (Галоўвыстаўком), Сафуранкаў (Белпалядоксаюз), Рагацкі (Белпайтрэст), Сарокін, Александровіч, Жалінскі (НК Паштэль), Максіменка, Шэпэль (чыгунка), Віктараў (Белгарсож), прафэсар Прыляжаеў і Змачынскі (БДУ), акадэмік Шпаталяў (БАН).

Апрача пералічаных таварышоў запрашаюцца ўсе спэцыялістыя гораду Менску, кіраўнікі ўдарных брыгад, і рацыяналізатарскіх груп на прадпрыемствах.

Рэдакцыя газэты «Чырвоная Зьмена» і Бел. МБІТ.

7-га лютага, а 12 гадз. дня, у памяшканьні Чырв. кутка «Белдзяржбуду» адбудзецца

АГУЛЬНЫ СХОД

адзіночак, разавікоў і беспрацоўных саюзу працмастацтва.

ПАРАДАК ДНЯ:

1) Аб веснавой пасеўнай кампаніі і аб пасылцы рабочых у калгасы.

У чацьвер, 6-II, а 6 ½ гадз. увечары, у Ленкутку ЦСУ (уваход з Камуністычнай, 11-16 з двара)

адбудзецца

АРГАНІЗАЦЫЙНЫ СХОД

рахункорых і статыстычных працаўнікоў гор. Менску—добраахвотнікаў на часовую і сталую працу ў КАЛГАСАХ.

У ПАРАДКУ ДНЯ: Аб падрыхтоўчых курсах для працы ў калгасах, якія адкрываюцца 7 лютага.

Абавязкова яўка ўсіх таварышоў-добраахвотнікаў, якія рэкамендаваны ФЗМК, або агульнымі сходамі.

ТЭАТР і КІНО

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР

І. Л. ПЭРЭЦ.

Пятніца, 7 лютага для каап. арцеляй і саматужнікаў адзінак. **НА ЛАНЦУГУ ПАКУТЫ**

Білеты ў клюбе саматужнікаў.

ЧАЦЬВЕР, 6 ЛЮТАГА

КЛЮБ «САУГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫ»

АДЗІНЫ ЛЕКЦЫЙНЫ ВЕЧАР

Прыбыўшага з Ленінграду старшыні т-ва „СТАРЫЙ ПЕТЕРБУРГ"

П. І. СТАУПЯНСКАГА

„Былые хозяева зимнего дворца"

На экране 150 мастацкіх карцін

Білеты ў рабочай касе. Падрабязнасьці ў афішах

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА

ГРОМАВА І МІЛІЧА

З прычыны ўзьняцьця посьпеху **2-гі** тыдзень мастацкі фільм

ГАЛУБЫ ЭКСПРЭС

Пачатак 1-га сэансу а 7 г. Каса ад 5 г.

КІНО Інтэрнацыянал

Нямецкі фільм вытворчасьці Уфа-фільм 1929 г.

2-гі тыдзень пастаноўкі

ВІНАВАТЫ (судовая памылка)

У галоўн. ролі БЭРНАРД ГЭТЦКЕ.

Пачатак 1 сэансу а 7 гадз. увеч. Каса адчынена ад 5 гадз.

КІНО Пралетары

2-гі тыдзень — 2-гі тыдзень

Копы амэрыканскі фільм.

МОАНА (СЫН ПАЎДНЁВЫХ МАРЭЙ)

у 7 част.

— ЗВЫШ ПРАГРАМЫ — кіно-хроніка Савкіно № 80

Пачатак роўна а 7 гадз. Каса—ад 5 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр"

Мастацкі фільм

ПАЛОНЬНІКІ МОРА

у 7 частках.

Звыш праграмы— навуковы фільм **КАЛМЫКІ** у 1 ч.

Пачатак 1-га сэансу а 2 г., 2-га—3 г. 20 м. Каса адчынена ад 12 гадз. дня.

КІНО Спартак

Выдатны мастацкі баявік

ВЯСЕЛАЯ КАНАРЭЙКА

Пачатак 1-га сэансу—а 6 г. 30 м. Каса—ад 6 гадз.

ЗАОЧНЫЯ КУРСЫ БУХГАЛЬТЭРЫ

Курсы рыхтуюць работнікаў для ліквідацыі капіталістычных арганізацый, крэдытных таварыстваў, арцеляй усіх відаў, калгасаў, саўгасаў і г. д.

Тэрмін навучаньня 8 месяцаў.

Прымаю